Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦКіМККП(б)Б, ЦВКіСНК БССР

№ 188 (5862) | 16 жніўня 1937 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

Ад урадавай камісіі па арганізацыі пералётаў Масква — Паўночная Амерыка. — Герой Совецкага Саюза тав. Галавін вылятае на востраў Дзіксон. — Росшукі самалёта «Н-209».

АРТЫКУЛЫ:

ПЕРАДАВЫ: — Мацаваць соцыялістычны парадак на вытворчасці.

Ершоў. — Наркамсабез засмечан ворагамі.

Р. Фралоў. — Горацкія справы.

Васільеў. — Аб лугапасьбішчных севазваротах і цалінных землях.

С. Галкін, М. Кік. — Метады самастрахоўшчыка.

На ўборцы ўраджаю: За 100 гектараў на ільнаперабілку. — Чаму прастойваюць малатарні. — Тав. Волкаў выцерабіў 142 гектары ільну.

У Ваенным Трыбунале БВА.

ЗА РУБЯЖОМ:

Ваенныя дзеянні ў Паўночным Кітаі. — Кітайскі ўрад аб кітайска-японскіх адносінах. — Паведамленне прадстаўніка японскага камандавання. — Рашэнне японскага совета міністраў. — Смерць палкоўніка Жэнь Юн-ко. — Заява Хэла. — Баі ў Шанхаі.

На франтах у Іспаніі. — Паўстанне ў войсках мяцежнікаў. — Выкрыццё шпіёнскіх центраў.

Новае пагадненне аб адзінстве дзеянняў паміж комуністычнай і соцыялістычнай партыямі Італіі.

Недахоп хлеба ў Германіі.

МАЦАВАЦЬ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ПАРАДАК НА ВЫТВОРЧАСЦІ

Большэвіцкая крытыка і самакрытыка — выпрабаваны метад кіраўніцтва і ўмацавання соцыялістычнага парадку на вытворчасці.

Таварыш Сталін на лютаўска-сакавіцкім пленуме ЦК ВКП(б) заклікаў партыю, усіх працоўных на разгортванне самакрытыкі. Ён указваў, што нам «самакрытыка патрэбна не для разбурэння працоўнай дысцыпліны, а для яе ўмацавання, для таго, каб працоўная дысцыпліна стала свядомай, здольнай устаяць супроць дробнабуржуазнай расхлябанасці».

У адказ на заклік правадыра, на нарадах вытворчага актыва, на прафсаюзных сходах загучэў баявёры голас пролетарскай самакрытыкі. Працоўныя бязлітасна, не гледзячы на асобы, выяўляюць недахопы гаспадарчага кіраўніцтва, шкодніцтва, выкрываюць ворагаў.

Большасць камандзіраў вытворчасці, правільна зразумеўшыя заклік таварыша Сталіна, скарыстоўваюць разгарнуўшуюся самакрытыку для ачысткі сваіх прадпрыемстваў ад трацкісцка-правых бандытаў, шпіёнаў, дыверсантаў і шкоднікаў, для навядзення большэвіцкага парадку на вытворчасці.

Знаходзіцца нямала, аднак, такіх гаспадарнікаў, якія не зразумелі сэнсу большэвіцкай самакрытыкі. Замест таго, каб на аснове самакрытыкі ўмацоўваць адзіначалле, яны выпусцілі лейцы, замест таго, каб узяцца з усім запалам за выпраўленне недахопаў, яны апусцілі рукі і перасталі змагацца з расхлябанасцю і шматлікімі недахопамі на прадпрыемствах.

Совецкі дырэктар, начальнік цэха, майстар — гэта людзі цвёрдай волі, арганізатары мас, патрабавальныя да саміх сябе і да сваіх падпарадкаваных. Разам з тым, гэта людзі, якія чула прыслухоўваюцца да голасу мас і хутка рэагуюць на іх правільныя ўказанні. Гэтыя якасці выхоўвае ў гаспадарнікаў наша партыя. Зацёны партыйныя арганізацыі павінны клапаціцца аб выхаванні ў дырэктару залявых якасцей, аб тым, каб прадпрыемствы сістэматычна авалодваў большэвізмам. На-жаль, аб гэтых сваіх абавязках забыліся некаторыя пярвічныя партарганізацыі. А пара ўжо ўзяцца за справу і вывесці некаторых забыўшыхся дырэктароў са стану злачыннага нейтралітэту ў адносінах да парушэнняў соцыялістычнага парадку на вытворчасці.

Паводле даных Цэнтральнага кіраўніцтва народнагаспадарчага ўчоту, на прадпрыемствах БССР у чэрвені было 13.827 чалавеказён прагулаў. Ганебная лічба!

Найбольшая колькасць прагулаў у тарфяной і цагельнай прамысловасці: на аднаго рабочага ў тарфяной прамысловасці прыпадае 0.31 чалавеказён, а ў цагельнай — 0.23. На Асінторфе ў чэрвені было 1.492 прагулы. Амаль кожны другі рабочы меў прагул. Ці можа быць больш абураючае становішча прапоўнай дысцыпліны? Ці разумее дырэктар Асінторфа тав. Шульгоўскі, што яго бязрукасць мяжуе з прамым злачынствам перад дзяржавай?

Не менш злачынна сябе вядуць дырэкцыя Асіпавіцкага торфзавода «Свабода», дапусціўшая за чэрвень 762 прагулы, дырэкцыя Магілеўскага цагельнага завода № 7 (479 прагулаў), дырэкцыя завода імя Кірава ў Менску (дырэктар Сарокін), дапусціўшая ў чэрвені 572 прагулы. Партыйныя арганізацыі наглядаюць гэтыя факты, бачаць бязрукасць дырэктароў і нічога не робяць. Няўжо сакратарам парткомаў патрэбна растлумачваць, што устанаўленне соцыялістычнага парадку на вытворчасці з'яўляецца іх кроўнай справай?

Некаторыя гаспадарнікі прымірыліся з прагуламі, не ядуць з імі барацьбы, не праводзяць у жыццё закон аб звальненні злосных прагульшчыкаў, ліберальнічаюць з парушальнікамі прапоўнай дысцыпліны. Партыйныя і грамадскія арганізацыі на гэтых прадпрыемствах закінулі масава-выхаваўчую работу. Трэба неадкладна ліквідаваць такія адносіны да барацьбы з дэзарганізатарамі соцыялістычнай вытворчасці, навесці большэвіцкі парадак на совецкіх заводах і фабрыках.

Ёсць яшчэ і такія камандзіры прадпрыемстваў, якія мірна наглядаюць за ведамственай грызнёй паміж цэхамі і не скарыстоўваюць сваю ўладу, якую ім далі партыя і ўрад, каб спыніць гэту антыдзяржаўную практыку, ад якой церпіць вытворчасць. Яны непатрабоўны да начальнікаў цэхаў, майстроў, да асобных рабочых. Яны, як бязвольныя слюнцяі, прымяраюцца з тым, што іх загады і распараджэнні не выконваюцца, чым, па сутнасці, самі развальваюць дысцыпліну і спрыяюць беспакаранай шкодніцкай рабоце ворагаў народа. На радзе прадпрыемстваў, у разультаце таго, што перасталі клапаціцца аб правільнай арганізацыі працы, аб жалезнай працоўнай дысцыпліне, пачасціліся і аварыі.

Многія дырэктары прадпрыемстваў з кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізуючых ліквідацыю вынікаў шкодніцтва, ператварыліся ў своеасаблівых агітатараў, заклікаючых масы ліквідаваць вынікі шкодніцтва. І відаць, да гэтага часу ніяк не могуць зразумець, што там, дзе расхлябанасць, дзе няма цвёрдай рукі адзіначальніка, там шырокае поле для дзейнасці ворагаў народа, там зынікі шкодніцтва не ліквідуюцца і не могуць быць ліквідаваны. Пара гэта зразумець гаспадарнікам і ўзяцца цвёрда за аператыўнае кіраўніцтва гаспадаркай, абучаючы людзей стаханаўскай рабоце.

Праводзячы ў жыццё адзіначалле, змагаючыся з усякімі спробамі парушэння ці падрыву яго, партыя адначасова вядзе барацьбу з бюракратычнымі скажэннямі прынцыпаў адзіначалля, скажэннямі, якія вядуць да безадказнасці, да адрыву гаспадарчых кіраўнікоў ад мас.

Партыя выхоўвае кадры кіраўнікоў у духу соцыялістычнага дэмакратызма. Яна вучыць чула прыслухоўвацца да голасу мас, хутка рэагаваць на крытыку знізу, раіцца з актывам, з «маленькімі» людзьмі. Кіраўнік совецкага прадпрыемства павінен спалучаць у сабе якасці цвёрдага адміністратара, здольнага патрабаваць суровай дысцыпліны, з якасцю совецкага дэмакрата, які апіраецца ў сваёй рабоце на вытворчы актыў. Але вырашаць абазвазан адзіначальнік, які асабіста адказвае перад дзяржавай за даручаную яму справу.

Большэвіцкае кіраўніцтва вытворчасцю не церпіць абялічкі і безадказнасці. Большэвіком камандзірам вытворчасці з'яўляецца толькі той дырэктар, які вядае наперад, як і куды трэба весці справу і дабіваецца гэтага. Той-жа, хто вядзе вытворчасць, паддаючыся настроям адсталых рабочых, гультаёў і лодыраў, той не дырэктар, а нікуды не варты слюнцяй.

Знішчаць бюракратычныя скажэнні адзіначалля, цвёрда, па-большэвіцку ажыццяўляць дырэктывы партыі, рашуча змагацца супроць дробнабуржуазнай распушчанасці, за жалезны парадак, за соцыялістычную дысцыпліну — вайпершы абавязак гаспадарчага кіраўніцтва ў БССР.

Барацьба за падняцце вытворчай дысцыпліны — справа не толькі адных гаспадарнікаў. У гэтым ім павінны аказаць падтрыманне партыйныя і грамадскія арганізацыі.

Польскія шпіёны, шкоднікі і дыверсанты несумненна будуць і надалей імкнуцца палярваць дысцыпліну на нашых соцыялістычных прадпрыемствах, сеяць недавер'е да распараджэнняў іх кіраўнікоў, каб з гэтага боку наносіць удары па нашай гаспадарцы. Патрэбна бязлітасна выкрываць ворагаў народа, рашуча выкарчоўваць іх з нашых заводаў і фабрык. Трэба навесці такі парадак на прадпрыемствах, пры якім план дваццатага года Вялікай пролетарскай революцыі быў-бы выканан, а дзеянні ворагаў сталі-б немагчымымі.



ІОСІФ ВІСАРЫЁНАВІЧ СТАЛІН.
Скульптура работы скульптара Авгура. Фото С. Грына.

НА ПЛЕНУМЕ ЦК ЛКСМБ

Учора ў Менску пачаў работу IV пленум ЦК ЛКСМБ.

Пленум заслухаў паведамленне сакратара ЦК ВЛКСМ тав. Пікінай аб становішчы Беларускай комсамольскай арганізацыі і аб выкрыцці ворагаў народа ў кіраўніцтве ЛКСМБ.

Былы сакратар ЦК Аўгустайціс свядома праводзіў палітыку захавання ў кіраўніцтве комсамольскімі арганізацыямі варожых людзей, стрымліваючы выкрыццё іх, падбіраючы кадры сямейным парадкам. І не выпадкова ў апараце ЦК прапітала падхалімства і ўгодніцтва, не было крытыкі і самакрытыкі. Гэта скарыстоўвалі прабраўшыяся ў кіраўніцтва ЦК ворагі для адцягнення ўвагі комсамольскіх арганізацый ад выкрыцця трацкісцка-бухарынскіх і іншых двурушнікаў.

Аднак спрэчкі, якія пачаліся пасля выступлення тав. Пікінай, паказваюць, што сярод членаў ЦК і комсамольскага актыва няма яшчэ сур'ёзнай большэвіцкай мабілізаванасці на выкрыццё ўсіх варожых людзей, прабраўшыхся ў комсамол. Наіўна і павярхоўна гучэлі прамовы многіх выступаючых. Не адчувалася жадання ўскрыць да канца пасобнікаў і стаўленікаў ворагаў. І гэта робіцца ў той час, калі ў цэлым радзе раённых комсамольскіх арганізацый, ды і ў самім ЦК ЛКСМБ, сядзяць яшчэ людзі не праверэныя, палітычна ненадзейныя, не апраўдваючыя сябе на рабоце. Надварот, гэтыя людзі бесперашкодна праводзілі і праводзяць яўна варожую практыку, накіраваную на падрыў комсамольскіх арганізацый.

Каму не вядома, што Куксевіч — стаўленік ворагаў і што яго практыка работы ў Менскім гаркоме комсамола выклікае яўную падазронасць? Гэты Куксевіч груба папірае правы комсамольцаў, заціскае крытыку і самакрытыку. Куксевіч правяліў работу адзела ЦК, але ворагі народу высунулі яго на пасаду сакратара гаркома.

Не раз праваліўшыя работу ў раёнах тт. Пакроўскі, Крэчат, Абугаў, Сазонаў — гэтыя любімчыкі былога кіраўніцтва ЦК, спакойна зараз адседжваюцца ў апараце ЦК ЛКСМБ, не гледзячы на неаднаразовыя выкрываючыя іх сігналы з нізавых арганізацый.

Выступаючыя на пленуме зусім не закранаюць незразумелых паводзін членаў бюро ЦК Бычкоўскага, Мазалеўскай і іншых, якія на працягу доўгага часу працавалі разам з ворагамі, ведалі аб іх дзейнасці, але з усім мірыліся.

Сёння на пленуме працяг спрэчак.

АД УРАДАВАЙ КАМІСІІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ПЕРАЛЕТАЎ МАСКВА—ПАЎНОЧНАЯ АМЕРЫКА

Урадавая камісія па арганізацыі пералётаў Масква — Паўночная Амерыка паведамляе, што на працягу 15 жніўня, не гледзячы на стараннае наглядання, не ўдалося ўстанавіць сувязі з радыёстанцыяй самалёта «Н-209». Асобныя станцыі СССР і Аляскі часам няясна чулі работу на хвалі самалёта, але няма ўпэўненасці, што працавала іменна яго радыя.

Работы па аказанню дапамогі, аб якіх учора паведамлялася, прадаўжаюцца. Ледакол «Красін» прыбыў на мыс Шміта, дзе робіць памост для пагрузкі самалётаў. Самалёты «Н-170», «Н-171» і «Н-172», якія вярнуліся з полюса ў Маскву, пераляцелі на авіяцыйны завод, дзе неадкладна пачата праверка самалётаў і падрыхтоўка іх да вылету. Рабочыя завода ўзяліся за гэту работу з выключным энтузіязмам, але ўсё ж падрыхтоўка чатырохматорных самалётаў патрэбуе некалькіх дзён. (БЕЛТА).

Герой Совецкага Саюза т. Галавін вылятае на востраў Дзіксон

КАЗАНЬ, 15 жніўня. (БЕЛТА). 14 жніўня ў Казань прыляцеў Герой Совецкага Саюза тав. Галавін. Яшчэ не ведаючы аб рашэнні ўрада па аказанню дапамогі самалёту тав. Леванеўскага, тав. Галавін паслаў Урадавай Камісіі наступную тэлеграму: «Экіпаж самалёта «СССР Н-206» лічыць таварыскім абавязкам прапанаваць свае паслугі для ўдзелу ў пошукавых аперацыях на нашым самалёце, у межах нашых магчымасцей. Галавін, Федзін, Чэчын, Фрутоцкі, Іваноў».

Позна вечарам тав. Галавін атрымаў з Масквы распараджэнне змяніць маршрут. Са Свердлоўска самалёт «Н-206» пойдзе ў Тюмень. Адтуль возьме курс на Поўнач і праз Обдорск паляціць на востраў Дзіксон. Там тав. Галавін будзе чакаць далейшых указанняў Урадавай Камісіі.

Штурман-радыст самалёта «Н-206» тав. Іваноў сёння вяртаецца ў Маскву для ўдзелу ў работах па аказанню дапамогі на самалёце «АНТ-6» Героя Совецкага Саюза тав. Вадап'янава. На самалёце «Н-206» штурманам-радыстам паляціць тав. Рубінштэйн.

Росшукі самалёта „Н-209"

НЬЮ-ЁРК, 14 жніўня. (БЕЛТА). Згодна паведамленню агенцтва Юнайтэд прэс, тры самалёты зрабілі палёт з Фербенкса на росшукі совецкіх лётчыкаў на самой Аляскі. Адзін самалёт «Локхід алектра» быў зафрахтован тав. Беляковым. Самалёт пілатаваў Джо Кросон. На борце самалёта знаходзіўся таксама спецыяльны карэспандэнт «Правды» тав. Хват. Гэты самалёт зрабіў палёт на Поўнач ка востраву Флэксмэн і, не вызвіўшы самалёта «Н-209», вярнуўся ў Фербенкс.

Другі самалёт «Фейрчайлд» (пілот Робінс і другі пілот Армістад, які прымаў удзел у выратаванні чэлюскінцаў) рабіў росшукі на паўночны захад. Самалёт пакрыў адлегласць у 400 кілометраў, пасля чаго вярнуўся ў Фербенкс.

Трэці самалёт «Фэйрчайлд» (пілот Марэй Сцюарт) зрабіў палёт на паўночны ўсход і пасля беспаспяховых росшукаў вярнуўся ў Фербенкс. На борце самалёта знаходзіўся таксама тав. Смірноў.

У росшуках экіпажа «Н-209» выказаў жаданне прыняць удзел таксама вядомы лётчык Матэрн.

Французскі друк аб самалёце „Н-209"

ПАРЫЖ, 15 жніўня. (БЕЛТА). Французскі друк аддае вялікую ўвагу становішчу экіпажа самалёта «Н-209». Газеты падрабязна паведамляюць аб мерах, прынятых совецкім урадам для росшуку экіпажа.

Французскія газеты, адзначаючы, што амерыканскі лётчык Матэрн прыме ўдзел у росшуках самалёта тав. Леванеўскага, указваюць, што ў 1933 годзе пасля аварыі ў Арктыцы Матэрн быў выручан з цяжкага становішча тав. Леванеўскім.

У МЕНСКІМ ГАРКОМЕ КП(б)Б

Бюро Менскага гаркома КП(б)Б запверзіла склад гарадской камісіі па падрыхтоўцы і правядзенню святкавання 20-гадавіны Вялікай Кастрычніцкай революцыі. У камісію ўваходзяць прадстаўнікі гаркома і райкомаў КП(б)Б, гаркома КСМ і часцей гарнізона. Старшыня камісіі — тав. Драбышэўскі.

Камісіі даручана распрацаваць мерапрыемствы па правядзенню святкавання і разгортванню прадкастрычніцкага спаборніцтва паміж прадпрыемствамі і раёнамі і прадставіць план для запверджання на чарговым пасяджэнні бюро.

У СНК БССР

Совет Народных Камісараў БССР прапанаваў гарадскім советам, раённым выканаўчым камітэтам і будаўнічым канторам неадкладна прыступіць да сканчэння незавершаных і тынкавальных работ па школах, пабудаваных у 1935—1936 гг. Для гэтых мэт горсоветам і райвыканкомам дазволена выдатказаць з рэзерваў па мясцоваму бюджэту 1.081 тыс. рублёў.

Саўнарком папярэдзіў старшынь горсоветаў і райвыканкомаў аб іх персанальнай адказнасці за сканчэнне гэтых работ да 1 верасня.

ПРЫЁМ У ВКП(б) У ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ЛЕНІНГРАДА

ЛЕНІНГРАД, 15 жніўня. (БЕЛТА). Сотні заяў аб прыёме ў партыю паступаюць у пярвічныя партыйныя арганізацыі Ленінграда.

За апошні час у кандыдаты ВКП(б) прыняты начальнік цэха фабрыкі «Скараход» ордэнаносец т. Сметанін, работніца фабрыкі «Большэвічка» ордэнаноска т. Сакалоўская, каваль Кіраўскага завода ордэнаносец т. Бобін, стаханаўцы таго-ж завода тт. Спепаненка, Зайцаў і шмат іншых.

З кандыдатаў у члены партыі пераведзены заслужаны дзеяч навукі, прафесар мельцыны тав. Гервер, вылатнейшы інжынер, даследчык высокавольтных хістанняў тав. Быкаў, стаханаўка фабрыкі «Красное знамя» т. Гірава і інш.

На партыйным сходзе на заводзе «Большэвік» пры абмеркаванні пытання аб прыёме ў кандыдаты партыі пеплатэхніка тав. Смірнова ярка выказалася настарожанасць схода, старанная праверка не толькі ўступаючых у партыю, але і тых, хто дае ім рэкамендацыю. Тав. Смірноў — вельмі добры работнік на вытворчасці. Ён ліквідаваў прарыў на адстаючым участку, увесь час павышае сваю палітычную граматнасць, паказвае ўзор адносін да партыйнай вучобы, але ў ліку рэкамендаўцых яго быў чалавек, палітычны твар якога выклікаў сумненні. Сход адагалосна рашыў адвесці гэту рэкамендацыю. Тут-жа т. Смірнову даў рэкамендацыю слесар тав. Варонін. Сход запверзіў гэту рэкамендацыю і пастанавіў прыняць т. Смірнова ў кандыдаты партыі.

(БЕЛТА).

СЯУБА АЗІМЫХ

У краіне пачалася асенняя сяўба. К 10 жніўня калгасам па Саюзу засеяны першыя 315.820 га азімых культур. У мінулым годзе к гэтаму тэрміну азімых было засеяна 812.300 га.

Паўночная вобласць выканала план амаль на 20 проц., Комі АССР — на 35 проц. і Кіраўская вобласць—на 17 проц. Першыя 7.300 га засеялі азімымі калгасы Украіны.

У большасці паўночных раёнаў нячорназёмнай паласы, гранічны тэрмін выканання плана для якіх — 25 жніўня, яшчэ не разгарнулі масавай сяўбы.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ПАЎНОЧНЫМ КІТАІ

Рашэнне японскага совета міністраў

ТОКІО, 14 жніўня. (БЕЛТА). Газеты «Асахі» і «Іомічуры» указваюць, што сёння назвычайнае пасяджэнне совета міністраў пастанавіла «значна павялічыць лік японскіх войск у Шанхаі». Газета «Хоці» піша, што японскія ўлады неадкладна прынялі меры для быстрага ажыццяўлення гэтага рашэння.

Прэм'ер Коноэ, згодна слоў «Хоці», сёння прапанаваў усім міністрам у любы момант быць гатовымі прымаць удзел у надзвычайных пасяджэннях совета міністраў, якія могуць быць скліканы ў залежнасці ад развіцця шанхайскіх баёў.

НАВЕТРАНЫ БОЙ

ШАНХАЙ, 15 жніўня. (БЕЛТА). Усе кітайскія газеты паведамляюць, што ў 5 гадзін вечара 13 жніўня 11 японскіх самалётаў, вылецеўшых з вострава Фармоза, зрабілі налёт на кітайскі аэрадром у Ханчжоу (правінцыя Чжэцзян). Кітайскія самалёты неадкладна адказалі на паветраную атаку. У разультаце паветранага бою тры японскія самалёты збіты. Адзін з іх упаў у Чашане, другі ўпаў у Сяошане (на паўднёвы ўсход ад Ханчжоу) і трэці—каля Цзяньтанцзяна. Два японскія лётчыкі ўзяты ў палон. 8 японскіх самалётаў, якія асталіся, зрабілі налёт на Гуандэ (ва ўсходняй частцы правінцыі Аньхуэй). Пасля паветранага бою з кітайскімі самалётамі 5 японскіх самалётаў былі часткова пашкоджаны і пазней зрабілі вымушаную пасадку ў Аньцзі (на граніцы правінцыі Аньхуэй і Чжэцзян). На Фармозу праз Вэньчоу вярнуліся толькі тры японскія самалёты.

КІТАЙСКІ ЎРАД АБ КІТАЙСКА-ЯПОНСКІХ АДНОСІНАХ

ШАНХАЙ, 15 жніўня. (БЕЛТА). Агенцтва Сентрал н'юс паведамляе аб афіцыяльнай заяве кітайскага ўрада з прычыны кітайска-японскіх адносін.

Заява пачынаецца з цверджання, што ў апошнія гады Кітай усе свае намаганні ўнутры краіны прысвячаў нацыянальнай рэканструкцыі, а ўвошку—захаванню ўсеагульнага міру і справядлівасці, строга захоўваючы ўсе свае абавязкі ў адносінах такіх міжнародных пагадненняў, як статут Лігі нацый, пакт Брыяндэ-Кэлага. Зараз Кітай вымушан прыняць меры самаабароны для таго, каб супроцьстаяць японскай агрэсіі, якая прадаўжаецца.

«Кітай,—гаворыцца ў гэтай заяве,— не ўступіць ніякай часткі сваёй тэрыторыі і будзе прымаць усе меры да самаабароны і супраціўлення ўсякай агрэсіі.

Калі Японія сапраўды не мае тэрытарыяльных дамаганняў у Кітаі, яна павінна папрабаваць знайсці разумнае вырашэнне кітайска-японскіх адносін і ў той-жа час спыніць усю сваю ваенную агрэсіўную дзейнасць у Кітаі. Калі гэта будзе зроблена, Кітай будзе і далей праводзіць сваю палітыку на базе сваіх традыцыйных мірных намераў.

Мы зараз змагаемся не толькі за Кітай, але за будучыню ўсяго свету, не толькі за нашы тэрытарыяльныя суверэнныя правы, але за ўсеагульную справядлівасць і мір».

Паведамленне прадстаўніка кітайскага камандавання

ШАНХАЙ, 15 жніўня. (БЕЛТА) У экстраным выданні газеты «Дагунбао» учора надрукавана наступнае паведамленне, выпушчанае ў поўдзень 14 жніўня прадстаўніком кітайскага камандавання:

1) Варожыя лініі блізка ад шанхайскага ўніверсітэта, на вуліцы Чункон-Роц і блізка ад універсітэта Цы-цзі на Суйцзянь-Род, сёння ў 5 г. раніцы знішчаны нашымі войскамі. Японскі атрад ва ўніверсітэце Цы-цзі лікам да 300 чалавек знішчан.

2) У сектары Люхэ, дзе нашы абарончыя лініі непрыступны, баёў не было. Усе спробы ворага зрабіць высадку ў гэтым сектары будуць ліквідаваны.

3) Маральнае становішча нашых войск вельмі высокае, войскі рашылі развіваць сённешнія перамогі да канца.

4) Мабілізацыя нашых паветраных сіл дала назвычай спрыяючы эфект. У 10 гадзін раніцы 6 нашых бамбардыроўшчыкаў з'явіліся над ракой Ванпу і скінулі тры бомбы на флагманскі карабель «Ідзумо» 3-й варожай флатыліі. Будынак адміністрацыі Нанкін-Шанхайскай чыгункі сёння раніцай паміж 8 г. 45 мін і 10 г. 20 мін. пашкоджан чатырма чапаўшымі ў будынак варожымі снарадамі.

Пасля панесенага паражэння ворог зараз скарачае свае лініі, канцэнтруючы іх на прыстані і па берагах ракі Ванпу у канцы вуліцы Янцзелу-Род. Штаб-кватэра японскага дэсанта на Цзяньван-Род эвакуявана, японскія канторы і казармы каля штаб-кватэры на Ванпу-Род разбураны нашымі снарадамі. Японцы панеслі з моманту шырокіх ваенных дзеянняў цяжкія страты. Нашы страты нязначныя.

Смерць палкоўніка Жэнь Юн-ко

ШАНХАЙ, 15 жніўня. (БЕЛТА). Газета «Шуньбао» паведамляе аб смерці палкоўніка Жэнь Юн-ко — другога пілота кітайскага бамбардыроўшчыка, зрабіўшага налёт на японскае флагманскае судно на рацэ Ванпу 14 жніўня. Палкоўнік Жэнь Юн-ко быў забіты, калі ў самалёт папалі снарады японскіх зенітных гармат. Першы пілот, не гледзячы на пашкоджанні самалёта, зрабіў удачную пасадку.

РУХ ЗА АРГАНІЗАЦЫЮ АБАРОНЫ НАНКІНА

ЛОНДАН, 14 жніўня. (БЕЛТА). Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што сярод кітайнаў зараз пачаўся рух за арганізацыю абароны Нанкіна па прыкладу Мадрыда. Завершаны неабходныя мерапрыемствы, звязаныя з абаронай Нанкіна.

ЗАЯВА ХЭЛА

ВАШЫНГТОН, 14 жніўня. (БЕЛТА). Дзяржаўны сакратар Хэл заявіў прадстаўнікам друку, што ўрад ЗША зрабіў «самыя сур'ёзныя прадстаўленні» японскаму і кітайскаму ўрадам і прасіў іх не ператвараць Шанхай у «тэатр ваенных дзеянняў». Паводле слоў Хэла, азіяцкая эскадра ЗША гатова ў выпадку неабходнасці быстра эвакуяваць 3 тысячы амерыканцаў з раёна Шанхая.

БАІ Ў ШАНХАІ

ШАНХАЙ, 15 жніўня. (БЕЛТА). Не гледзячы на тайфун, бой ў Шанхаі ноччу з 14 на 15 жніўня прадаўжаўся да 4 гадзін раніцы. Каля 9 гадзін раніцы артылерыйская стральба адналася.

Сёння ў 13 гадзін паветраны і артылерыйскі бой аднавіўся.

ДАКЛАДНА І У ТЭРМІН ВЫКАНАЦЬ ПАСТАНОВУ СНК СССР І ЦК ВКП(б)

САМАСУПАКАЕННЕ ГАРАДОЦКАГА І МЕХАЎСКАГА РАЙКОМАЎ

У Мехаўскім раёне ў асобных калгасах несур'ёзна аднеслісь да надзялення гаспадарак прысядзібнымі ўчасткамі. Гістарычная пастанова СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) у асобных калгасах нават не абмяркозана на сходах, не даведзена да ўсіх калгаснікаў.

У выніку гэтага атрымалася, што ў некаторых калгасах надзяленне гаспадарак прысядзібнымі ўчасткамі яшчэ не закончана. У калгасе «Ільіч», Мехаўскага сельсовета, выявілася, што калгасніца Якаўлева Е. М. мела прысядзібны ўчастак менш 0,20 гектара. Праўленне-ж калгаса ў гэты час заяўляла, што прысядзібнымі ўчасткамі забяспечаны ўсе калгаснікі ў норме ад 0,25 да 0,50 гектара. У гэтым калгасе яшчэ не абмеркавана пастанова партыі і ўрада.

Такое-ж становішча ў Гарадоцкім раёне, дзе пастанова СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б) не даведзена да шырокіх мас калгаснікаў. У калгасе «Перамога», Першамайскага сельсовета, зусім не было схода.

Гэта гаворыць аб тым, што раённыя арганізацыі, у прыватнасці райком КП(б)Б не правялі палітычна-масавую работу сярод калгаснікаў вакол гістарычнай пастановы партыі і ўрада. Замест няўхільнага ажыццяўлення пастановы ў райкоме КП(б)Б панае самасупакаенне.

А на самой справе ў рабоце па надзяленню калгасных гаспадарак у раёне дапушчана многа памылак. Напрыклад, у калгасе імя Калініна, Першамайскага сельсовета, калгасніцы Зверковай А. В. адвялі прысядзібны ўчастак у трох месцах, прычым адзін з іх за поўкілометра ад хаты.

Падобныя факты маюць месца і ў другіх калгасах. У асобных калгасах прысядзібныя ўчасткі асталіся далёка ў полі і да двароў не перанесены.

Як у Гарадоцкім, так і ў Мехаўскім раёнах слаба праходзіць перадача калгасам лясоў і лясных угоддзяў. Усё яшчэ працуюць камісіі, а калгасы лясоў, якія ім перадаюцца, не ведаюць.

Нельга не адзначыць і таго, што ў раёнах не даведзены да калгасаў планы асенняй сяўбы. Райземаддзел праяўляе злачынную непаваротлівасць, зацягвае гэту важнейшую работу.

Раённыя арганізацыі Гарадка і Мехава не прынялі ўсіх мер, каб своечасова ажыццявіць пастанову СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б).

КРЫВАШЗЕЎ, МУРАШКЕВІЧ.

НЕ УСЕ КАЛГАСНІКІ НАДЗЕЛЕНЫ ПРЫСЯДЗІБНАЙ ЗЯМЛЁЙ

У Брагінскім раёне 565 калгасных гаспадарак атрымалі прысядзібныя ўчасткі агульнай плошчай у 79,29 гектара, у Крычанскім сельсавеце прырэзаны ўчасткі 134 гаспадаркам, Хракавіцкім—127, Малейкаўскім—63 і т. д.

Аднак, работа па выяўленню гаспадарак, якія трэба надзяліць сядзібамі, праводзілася ў раёне наспех і яшчэ не закончана. У калгасе імя Варашылава, Астраглядаўскага сельсовета, з 5 гаспадарак, не маючых мінімальнай нормы, не надзелена ні адна.

Наогул работа па надзяленню калгасных гаспадарак прысядзібнымі ўчасткамі ў Брагінскім раёне праведзена з вялікімі памылкамі і скажэннямі. У выніку штодзённа ў райземаддзел ад калгаснікаў паступае шмат скарг, што ім не прырэзалі прысядзібныя ўчасткі.

Яшчэ горш пастаўлена работа па перадачы лясоў і іх угоддзяў у карыстанне калгасам. У раёне ніяк не могуць дагаварыцца, якія перадаваць лясы—мясцовага значэння, ці з дзяржаўнага фонда.

З усяго гэтага відаць, што кіраўнікі Брагінскага раёна зрываюць выкананне ў намечаныя тэрміны гістарычнай пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б).

ПРОТЧАНКА.

АДНААСОБНІКІ ЎСТУПАЮЦЬ У КАЛГАСЫ

У адказ на клопаты і дапамогу беларускаму сялянству аднаасобнікі Кіраўскага раёна ўступаюць у калгасы.

За апошнія 5 дзён у калгас імя Гікало Любоніцкага сельсовета ўступіла 11 аднаасобнікаў. У калгас «Чырвоныя Моркавічы», гэтага-ж сельсовета, уступіла 3 аднаасобнікі, у калгас імя Варашылава, Асоўніцкага сельсовета—4 аднаасобнікі, у калгас «Другая пяцігодка» Капуснінскага сельсовета — 4 аднаасобнікі.

Па Казулінскаму сельсовету з часу выдання пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) у калгасы ўступіла 51 гаспадарка аднаасобнікаў.

М. ЯРЧАК.

***

У Хойніцкім раёне адбыліся сходы аднаасобнікаў, на якіх шырока абмяркоўвалася пастанова партыі і ўрада аб льготах для аднаасобных гаспадарак, што ўступаюць у калгас.

У адказ на бацькоўскія клопаты правадыра народаў таварыша Сталіна працоўныя аднаасобнікі ўступаюць у калгасы. У калгас «Маяк» (Вялікаборскі сельсавет) на агульным сходзе былі прыняты апошнія тры аднаасобнікі гэтай вёскі Папяруха Сяпан, Казімірчук Ілья і Іванюшка Юзік. У калгас імя Сталіна падалі заявы аднаасобнікі Новік Нікалай і Новік Рыгор, у калгас «Соцыялізм» — Камеш Алена і Камеш Ганна.

Прыліў аднаасобных гаспадарак у калгасы пашыраецца.

ПУГАЧ.

БУДЗЕМ МАЦАВАЦЬ КАЛГАСНЫ ЛАД, СВОЕЧАСОВА І БЕЗ СТРАТ УБЯРОМ БАГАТЫ ЎРАДЖАЙ

Ва ўсіх калгасах Касцюковіцкага раёна адбываюцца многалюдныя сходы, прысвечаныя гістарычнай пастанове СНК Саюза ССР і ЦК ВКП(б).

— Ворагі народу, — заявіў на сходзе сельгасарцелі «Рассвет», Студзянецкага сельсовета, калгаснік Селязнёў Г., — нямала нашкодзілі ў нашай сацыялістычнай сельскай гаспадарцы. Мы павінны як мага хутчэй ліквідаваць вынікі шкодніцтва.

Калгаснікі ў адказ на пастанову партыі і ўрада абавязуюцца з дня ў дзень мацаваць калгасны лад, своечасова і без страт убраць багаты ўраджай, высока ўзняць кошт працадня ў калгасе.

С. КУЦАЕЎ.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Другая пяцігодка» Брагінскага раёна з радасцю сустрэлі пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству Беларускай ССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпраўкавання. НА ЗДЫМКУ: старшыня калгаса тав. Вініцкі С. А. у час перапынку чытае калгаснікам газету «Звязда» з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б).

Фото Цалуйка (БСФ).

ВЯЛІКІ ТВОРЧЫ ЎЗДЫМ У КАЛГАСАХ БЕЛАРУСІ

(Па пісьмах калгаснікаў)

Калгаснік сельгасарцелі імя Ільіча, Калодзецкага сельсовета (Чэрвеньскі раён) Вяргейчык Фёдар на агульным сходзе заявіў:

— Штодзённыя клопаты комуністычнай партыі і совецкага ўрада і асабіста роднага і любімага Сталіна аб калгасніках натхняюць нас на лепшую работу. Зробім нашы калгасы сапраўды большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі. Мы яшчэ шчыльней згуртуемся вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол нашага любімага правадыра таварыша Сталіна.

У адказ на вялікую дапамогу і льготы, якія прадастаўлены партыяй і ўрадам беларускаму сялянству, калгаснікі абавязаліся яшчэ больш павысіць рэвалюцыйную пільнасць, да канца выкарчаваць ворагаў.

П. ШУТ.

***

«Мы, калгаснікі сельгасарцелі «Чырвоны красавік», Кароткаўскага сельсовета (Жлобінскі раён), на клопаты і дапамогу нашай комуністычнай партыі, совецкага ўрада і асабіста таварыша Сталіна адказваем пасіяховым правядзеннем уборкі, малацьбы і выкананнем абавязковых паставак дзяржаве. Добра правядзем асенняю сяўбу, закончым сельскагаспадарчы год са стахانаўскімі паказальнікамі работы. Зробім усё, каб яшчэ больш умацаваць нашу калгасную гаспадарку, дабіцца высокай аплаты працадня».

Па даручэнню калгаснікаў: САВАСЦЯНЧЫК.

Калгаснік сельгасарцелі імя Будзённага (Асіпавіцкі раён) Баразна Мікола, выступіўшы на сходзе, заявіў:

— На велізарную дапамогу і бацькоўскія клопаты таварыша Сталіна аб нас, калгасніках, мы адкажам дружнай стахانаўскай работай. Даб'ёмся таго, каб у гэтым годзе атрымаць на працадзень па тры кілограмы збожжа і два рублі грашыма. Зробім наша жыццё заможным і культурным.

Я. РУБІНШТЭЙН.

***

У калгасе «Прагрэс» Акшынскага сельсовета (Свяцілавіцкі раён) на сходзе калгаснікі Баранаў А., Манкевіч Л., Самусеў А. адзначалі, што вынікі шкодніцтва ў іхняй сельгасарцелі яшчэ не ліквідаваны. Пасля ўборкі жыта ў полі астаецца шмат каласоў, збор якіх не арганізован. Раённыя арганізацыі, як райземаддзел і дырэкцыя МТС не вывучаюць людзей, не рыхтуюць кадраў. І ў калгасе «Прагрэс» у праўленне праляезлі злодзеі, жулікі, якія раскрадвалі калгаснае дабро.

— Мы будзем весці бязлітасную барацьбу з тымі, хто паспрабуе пасягнуць на наша калгаснае жыццё,—заявіў на сходзе дэлегат усебеларускай нарады старшынь калгасаў тав. Ксяндоў. — Добрасумленнай работай забяспечым хуткую і добраякасную ўборку ўраджаю, выканаем абавязацельствы перад дзяржавай, паднімем кошт працадня ў калгасе.

П. ЯЗЕРСКІ, П. ЖАРЫКАЎ.

АБМЯРКОУВАЕМ ПРАЕКТ АБ УВЯДЗЕННІ ПРАВІЛЬНЫХ СЕВАЗВАРОТАЎ

АБ ЛУГАПАСЬБІШЧНЫХ СЕВАЗВАРОТАХ І ЦАЛІННЫХ ЗЕМЛЯХ

У праекце аб увядзенні правільных севазваротаў гаворыцца толькі аб палявых землях. Гэтым не павінна канчацца навядзенне большэвіцкага парадку па выкарыстанню зямель. Трэба ўнесці яснасць і ў пытанне асваення і выкарыстання 200.000 гектараў цалінных зямель, якія даны для БССР.

Цалінныя землі адразу ў севазварот не ўвойдуць. Многія масівы цалінных зямель будуць адарваны ад палявых абасобленымі ўчасткамі. Відавочна, што яны патрабуюць зусім другога пераходу к правільнаму севазвароту, чым на палявых ворыўных землях. Тут пойдуць такія культуры, як віка з аўсом, азімая і яравая пшаніца, лён, авёс.

У пераходныя гады наяўнасць паказаных культур на ўноў асваяемых землях будзе дыктавацца патрэбнасцю пазбегнуць рэзкага скарачэння зернавых, харчовых і фуражных культур. Пры ўвядзенні севазваротаў з двума палямі шматгадовых траў па палявых землях, пры частковым размяшчэнні на ўноў асваяемых землях сямівасьмімпольных севазваротаў, прадастазіцца магчымым мець не адно поле ў севазвароце азімых, а паўтара поля на 4—5 гадоў. Рэзкае павышэнне ўраджаю як вынік эфектыўнасці севазвароту задаволіць наша запатрабаванне ў харчовых культурах з аднаго поля севазвароту.

Нічога не сказана ў праекце аб увядзенні лугапасьбішчных севазваротаў. Гэта пытанне для раду раёнаў БССР (Крупскага, Аршанскага, Талачынскага, Горацкага, Менскага і інш.) набывае актуальнае значэнне. Узяць, напрыклад, калгас «Чырвоны герой», Крупскага раёна. У калгасе 422 гектары ворыва, 108 гектараў сухадольнай сенажаці і 2 гектары выганаў. Суадносіны ворыва да сенажаці 4:1. А каб пракарміць стада жывёлы ў выпасны перыяд, патрабуецца мінімальна 1.400 тон зялёнай масы. Для таго, каб выйсці з такога становішча, праўленне калгаса «Чырвоны герой» патрабавала ўвесці лугапасьбішчны севазварот на плошчы 55 гектараў сенажаці з наступным чаргаваннем культур: першае поле віка з аўсом, другое — сілосныя корнеплоды, трэцяе — авёс з падсевам траў, чацвертае і пятае — травы на ўкос, шостае і дзесятае поле — травы для выпасу. Палявы васьмімпольны севазварот будзе даваць 105 гектараў шматгадовых траў на ўкос з лугапасьбішчнага севазвароту, што цалкам забяспечыць стала кармамі ў стойлавы перыяд.

Такое становішча з выпасамі не ў адным толькі калгасе «Чырвоны герой». Такое становішча ў калгасах «Полымя», імя Крупскай Крупскага сельсовета і інш.

Трэба абавязкова запісаць у праекце аб падсеве шматгадовых траў на палосах адчужэння каля раённых і дзяржаўных грунтавых і шасейных дарог, што створыць трывалы травяны пласт і гэтыя травы ля дарог з'явяцца дадатковай крыніцай кармавых рэсурсаў.

Некалькі слоў па сутнасці 7—8-польных севазваротаў, якія рэкамендуюцца для ільнаводчых калгасаў нячорназемнай паласы. Адно поле азімых у севазвароце не ва ўсіх калгасах забяспечыць патрэбнасць у хлебе. Там, дзе не будуць улічаны гэтыя асаблівасці, севазварот будзе парушацца самімі калгаснікамі. Па-другое, не ва ўсіх выпадках у калгасах магчыма заняць цалкам поле пад пасеў ільну. Узяць хаця-б калгас «Ударнік», «Чырвоная горка», Абчугскага сельсовета Крупскага раёна, дзе глебы — пяжкія суглінкі і гліны, рэльеф бугрысты. У гэтых калгасах ніяк не займеш цэлага поля ільном. Тут безумоўна патрэбна будзе спалучыць пасеў ільну не толькі з севазваротам, але і з распашкамі і асваеннямі новых зямель.

ВАСІЛЬЕЎ.

Аграном крупскага райземаддзела.

НЕКАЛЬКІ СЛОЎ ПРА ПАПЯРЭДНІКІ І БРЫГАДНЫЯ ЎЧАСТКІ

На мой погляд, у праекце Камісіі Наркамзема СССР і Наркомсоўгасаў «Аб увядзенні правільных севазваротаў» патрэбна ўнесці дадатак у пункце аб брыгадных участках у палях севазвароту.

У кожным полі павінен быць адведзен кожнай паляводчай брыгадзе брыгадны ўчастак зямлі, які замацоўваецца за ёю на ўвесь перыяд севазвароту. Аб гэтым патрэбна адзначыць у праекце.

Апрача таго неабходна было-б уключыць у праект пункт аб папярэдніках. У кожным раёне з папярэднікамі атрымліваецца пасвойму. Напрыклад, на Случчыне па бульбянішчы сеюць авёс, пад які падсяваюць канюшыну, а на Барысаўшчыне наадварот, такі добры папярэднік, як бульбянішча, скарыстоўваецца пад яравую пшаніцу і ячмень, таксама з падсевам канюшыны.

Авёс, як вядома, вельмі спусташае глебу і зачастую па аўсяніішчы канюшына дае слабы ўраджай.

Таму я лічу, што аб папярэдніках трэба ў праекце ўнесці дадатак, бо папярэднік з'яўляецца неадрыўнай часткай у справе ўвядзення правільных севазваротаў.

Аграном В. МАЛЯЎКА.

Пухавіцкі раён.

НА НАРАДАХ КАЛГАСНІКАЎ

У Рагачоўскім раёне праведзены нарады і сходы ў калгасах па абмеркаванню пытання аб увядзенні правільных севазваротаў, на якіх калгаснікі выказваюць свае думкі, уносяць прапановы і дадаткі.

Калгаснікі сельгасарцелі «Новы свет» прапануюць шырэй уніядрыць у калгасах кармавую капусту. Яна дае высокі ўраджай зялёнай масы—5—6 тысяч пудоў з гектара. Калгаснікі звяртаюць таксама ўвагу на ўрэгуляванне землекарыстання ў калгасах.

— Нашы спрадвечныя мары аб зямлі збыліся, — гаворыць калгаснік сельгасарцелі «13 год Кастрычніка», Галзілаўскага сельсовета Войтаў.—Зараз зямлі ў калгасах хапае ўдоваль. Аб гэтым паклапацілася наша комуністычная партыя і совецкі ўрад, наш любімы правадыр таварыш Сталін. Нам асталося толькі добрасумленна працаваць, каб знімаць з зямлі, якая замацавана за калгасам на векі, добрыя ўраджаі. А для гэтага нам трэба вывучаць агратэхніку, вывучаць сваю зямлю, увесці правільны севазварот, каб у ім была канюшына, люцэрна і лугапасьбішчныя травы.

Намеснік старшыні калгаса «13 год Кастрычніка» Казлоў гаворыць аб неабходнасці асвойваць новыя землі. Калгас ужо асушыў 70 гектараў балота, на якім добра растуць травы і іншыя культуры.

Як вядома, у Рагачоўскім раёне шмат пясчанай глебы. Калгаснік сельгасарцелі «Чырвоная Дуброва» П. Прасняковў прапануе замест чыстага папару ўвесці лубінавы з заворваннем яго пад азімыя. Па вопыту гэтага калгаса лубін на зялёнае ўгнаенне павышае ўраджай пясчанай глебы на 30—35 проц. супроць чыстых папараў.

Такія думкі выказваюць многія калгаснікі.

МАКСІМЫЧ.

НА ЎБОРЦЫ УРАДЖАЮ

ПАТУРАЮЦЬ ШКОДНІКАМ

Уборку зернавых у калгасе імя Сталіна, Мастоцкага сельсовета, Магілеўскага раёна, сустрэлі непадрыхтавана. Чатыры жняяркі-снопавязалкі і самаскідкі стаяць неадрамантаванымі, а перастаяўшае збожжа косяць уручную, потым грабуць граблямі. У рэзультаце больш паловы збожжа астаецца на полі.

Абмалочаны камбайнам вільготны ячмень ссыпан у дом былых дзіцячых ясляў, дзе ён згараецца і прыхоўзіць у нягоднасць. Старшыня калгаса Сідаренка на гэта глядзіць абыякава, ніякіх мер не прымае. Побач з гэтым домам стаіць неадрамантаваная зернасушылка. Ніхто яе і не думае рамантаваць.

Калгаснікі абураны паводзінамі старшыні калгаса і старшыні сельсовета Шабека, якія патураюць шкоднікам.

А. РАМАНЬКОЎ.

СТАРШЫНЯ КАЛГАСА ПАРУШАЕ СТАТУТ

Марудна ідзе уборка ўраджаю, абмалот і здача дзяржаве збожжапаставак у калгасе імя Варашылава, Машанецкага сельсовета, Бярэзінскага раёна. Пасля звозу збожжа на полі астаецца вялікая колькасць каласоў.

У калгасе дрэнна пастаўлен учот працадзён. У прапоўныя кніжкі калгаснікаў за апошнія 2 месяцы яны яшчэ не запісваліся. Старшыня калгаса Шупа груба парушае статут сельскагаспадарчай арцелі, ён без рашэння агульнага схода калгаснікаў аддае не-членам арцелі касіць калгасныя сенажаці.

У калгасе панае сямейнасць і запіск самакрытыкі. Старшыня калгаса выконвае адзве функцыі — старшыні калгаса і касіра. У калгасе многа растрат, і ніхто не знаходзіць іх канцоў.

М. ЛІСОЎСКІ.

ЗА 100 ГЕКТАРАЎ НА ІЛЬНАЦЕРАБІЛКУ

Касцюковіцкая МТС у барацьбе за права ўдзелу ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў 1938 годзе ўзяла на сябе абавязацельства выцерабіць кожнай ільнацерабілкай «ВНІІЛ-5» сто гектараў лёну. Гэта абавязацельства намі выконваецца.

На 10 жніўня выцераблена 10-цю ільнацерабілкамі 945 гектараў, што складае ў сярэднім на кожную церабілку 94,5 гектара. Лепшыя стаханаўцы, узяўшыя абавязацельства выцерабіць 120 і больш гектараў, выконваюць яго з поспехам. Ільнацерабільшчык Грынёў Дамітрый і трактарыст Аўтухоў Герасім на 10 жніўня выцерабілі 123 гектары. Яны церабілі лён ў шасці калгасах. Ільнацерабільшчык Хомчанка і трактарыст Дарашэнка Пятрусь выцерабілі 106 гектараў. Гэту плошчу яны выцерабілі ў пяці калгасах, і зараз працуюць у калгасе «Пяцігодка за чатыры гады», дзе выцерабяць яшчэ 20 гектараў. Ільнацерабільшчык Сасонкін і трактарыст Ісакаў выцерабілі 105 гектараў, Талчынскі і Вавілаў — 102 гектары.

Усе церабільшчыкі ў часе работы мелі правільныя маршруты; участкі былі падрыхтаваны загадзя. Вялікую дапамогу аказалі церабільшчыкам участковыя аграномы. Старшы механік тав. Бяспалаў добраякасна правёў рамонт. Для ільнацерабілак пры выездзе ў поле вылавалася неабходная колькасць запасных частак. Механік перыядычна аб'язджаў усіх церабільшчыкаў, на-ходу знішчаў усе непаладкі.

Наша абавязацельства даць 100 гектараў на кожную ільнацерабілку ў бліжэйшыя дні будзе выканана.

ІСАЧЭНКА.

Нам. дырэктара па палітчасці.

ЧАМУ ПРАСТОЙВАЮЦЬ МАЛАТАРНІ

У Лельчыцкай МТС складаных і поўскладаных малатарань ёсць у дастатковай колькасці. Да абмалоту ў калгасах складанымі малатарнямі МТС прыступіла 16 ліпеня. За гэты час 15 малатарнямі можна было намалаціць як мінімум 4.050 тон. Намалочана-ж усяго 622 тоны.

Прычына нізкай прадукцыйнасці ў тым, што малатарні з-за няспрэўнасці прастойваюць. У калгасе «Пабеда», Глушкавіцкага сельсовета, складаная малатарняй «МК-1100» з 20 па 29 ліпеня намалочана толькі 25 тон, у той час як яна гэта магла-б зрабіць за 20 рабочых гадзін. У калгасе «Новая ніва» малатарняй «МК-1100» за той-жа час намалочана 32 тоны, што складае толькі па чатыры тоны за дзень. У калгасе «Прагрэс», Сіманіцкага сельсовета, малатарняй «БДО» з 20 па 26 ліпеня намалочана 21 тона, у калгасе «Шлях соцыялізма», Лельчыцкага сельсовета, з 25 па 30 ліпеня намалочана 13 тон і ў калгасе імя XV з'езда ВКП(б) (Стадоліцкі сельсавет) малатарняй «МК 1100» за 12 дзён намалацілі 25 тон. Такіх фактаў можна было-б прывесці вельмі многа. Усе малатарні, што ёсць у МТС, больш прастойваюць, чым працуюць.

Зрыў работы малатарань і адгэтуль — зацяжка абмалоту ў калгасах не выпадковыя. Шкоднікі, якія прытаіліся ў МТС, імкнуцца запягнуць малацьбу да глыбокай восені, да дажджоў і згнаіць калгасны хлеб, які ляжыць не ў гумнах, а ў тарпах на полі. Абмалочваць яго можна толькі ў добрае надвор'е, а не ў дождж. Зацяжка малацьбы ставіць пад пагрозу правядзенне асенняй сяўбы ва ўстаноўленыя тэрміны і выкананне абавязковых паставак дзяржаве.

Аб гэтых шкодніцкіх дзеяннях гаварылі на раённым партыйным сходзе, які адбыўся 5 жніўня. Асабліва многа сігналаў паступае на дырэктара МТС Ждановіча, які разам з ворагамі нарола зрываў работу машынна-трактарнай станцыі. Аднак і да гэтага часу Ждановіч астаецца ў МТС.

ЯКУБОВІЧ.

12 ГЕКТАРАЎ ЗА ДЗЕНЬ

Ільнацерабільшчык Добрамыслянскай МТС, Лёзанінскага раёна, тав. Пётр Салаўёў і трактарыст Павел Стараверaў, працуючы на ільнацерабілцы «ВНІІЛ-5», 2 жніўня выцерабілі 12½ гектараў ільну. Калгаснікі задаволены іх добраякаснай работай.

Парторг МТС П. М. ЮШКЕВІЧ.

Тав. ВОЛКАЎ ВЫЦЕРАБІЎ 142 ГЕКТАРЫ ІЛЬНУ

Бялыніцкая МТС дабілася поспехаў у скарыстанні ільнацерабілак па ўборцы ільну. 6 ільнацерабілак выцерабілі 480 гектараў.

Лепшыя ільнацерабільшчыкі: Волкаў П. выцерабіў 142,31 гектара, Бычкоўскі В.—97,83 гектара, Часлаўскі П.—88,5 гектара, Маслянкоў В.—87,84 гектара.

ЗАЛОГА.

Намеснік дырэктара МТС па палітчасці.

40 ЦЭНТНЕРАЎ ЯЧМЕНЮ З ГЕКТАРА

Соўгас «Ведрыч» Рэчыцкага раёна размешчан на асвоеным тарфяніку, дзе раней было непраходнае балота.

Добры ўраджай знімае соўгас з гэтых балот. Сёлетні ўраджай большы, чым за ўсе ранейшыя гады. На ўчастку брыгадзіра Жураўскага плошчай у 4,74 гектара атрымана 40,2 цэнтнера ячменю. На плошчы ў 11,97 гектара ўраджай ячменю дасягнуў 34,15 гектара.

Яравізаваны пасеў даў прыбыўкі на кожны гектар 5,9 цэнтн.

Аграном А. ТРОІЦКІ.

АБ НОВАЙ МТС І СПРАВАХ ЛАБЗАКОВА

Кастрычніцкая МТС (Плешчаніцкі раён) арганізавалася ў 1936 г. Як-жа Наркамзем БССР, у прыватнасці былы начальнік Зернавога кіраўніцтва Лабзакоў, дапамагаў новай і пры тым яшчэ пагранічнай МТС?

У МТС ёсць 37 трактараў. З іх 15, у тым ліку 5 «ЧТЗ», без плугоў. У выніку — 2 «ЧТЗ» ужо трэці месяц стаяць без работы. Лепшыя трактарысты-стаханаўцы Бортка Жэня, Вярбіцкі і Шастаковіч ходзяць без работы. Яны патрабуюць плугоў, а іх няма. Лабзакоў толькі абяцаў. А плугі яшчэ не прысланы.

Ёсць у МТС 4 аўтамашыны. Дзве з іх стаяць на калодках пад павеццю, без рэзіны, трэцяя таксама ўжо разбіта і не можа хадзіць у Барысаў за гаручым. Скора стане і апошняя — чацвертая аўтамашына.

Ведаючы аб такім становішчы, Лабзакоў выдзеліў толькі 4 пакрышкі, а суседняя Плешчаніцкая МТС, якая забяспечана ўсім, атрымала 10—12 пакрышак.

Ніякіх сродкаў для перасоўвання ў МТС няма.

У МТС яшчэ не закончана абсталяванне канторы. Сродкі для гэтай мэты не адпушчаны. З-за адсутнасці сродкаў зрываецца ўстаноўка такарнага станка, які ляжыць пад павеццю без карысці. МТС не мае спецыяльнага памяшкання для запасных частак, не закончана будаўніцтва павеці для трактараў і машын. Зімой машыны і інвентар стаяць у снягу.

Лабзакоў у красавіку быў у нашай МТС. Былы дырэктар МТС, выкрыты зараз як трацкіст, заліў гаралкай вочы Лабзакову.

Лабзакоў трымаў цесную сувязь з трацкістам — дырэктарам МТС. Ён ведаў, што за першае паўгоддзе перазыдатак па МТС складае 13.045 р., аднак прахалзіцеп і злодзей Крумен П. Р. доўга аставаўся на пасадзе галоўнага бухгалтара. Лабзакоў, па сутнасці, пакрыў растрату Крумена і Капмана ў суме 4.716 руб.

Усё гэта прымушае зацікавіцца сапраўдным тварам Лабзакова і да канца высветліць прычыны злачынных яго адносін да Кастрычніцкай МТС.

В. ЯКАВІЦКІ.

Нам. дырэктара МТС па палітчасці.

БЮРАКРАТЫ З ЦП САЮЗА КОМУНАЛЬНА-ЖЫЛЛЁВАГА БУДАЎНІЦТВА

У студзені 1935 года пры Лельчыцкім райвыканкоме была арганізавана профгрупа. Выбраны прафорг аб гэтым своечасова паведаміў ЦП саюза комунальна-жыллёвага будаўніцтва БССР. Таксама ён сістэматычна паведамляў ЦП саюза аб праробленай працы і настойліва прасіў прысылаць указанні аб рабоце. Прайшло два гады, але ніякага адказу з ЦП саюза не атрымалі.

Нарэшце, 22 сакавіка ЦП саюза (старшыня Бражынскі, яго намеснік Пропін) дадумалася абмеркаваць пытанне на прэзідыуме ЦП саюза аб... арганізацыі профгрупы пры Лельчыцкім РВК. Сваю выпіску з пратакола яны прыслалі ў РВК.

Бачачы бюракратычнае кіраўніцтва Бражынскага і Пропіна, профгрупа ў ліпені месяцы камандыравала мяне ў Менск у ЦП саюза. Задача маёй паездкі заключалася ў тым, каб атрымаць ад ЦП саюза ўказанні па рабоце. Але дарэмна. Ніякага ўказання тут я не атрымаў і ні з чым вымушан быў вярнуцца назад.

Ці так павінны кіраўнікі ЦП саюза адносіцца да запрофаў сваіх членаў саюза?

А. Е. МАЗУРЫК.

ГОРАЦКІЯ СПРАВЫ

У свой час у Горацкім раёне адкрыта арудвалі эсэраўска-кулацкія банды. У асобных месцах яны арганізоўвалі паўстанні супроць совецкай улады. Многія ўдзельнікі, нават главары цаўстаняў прытуліліся і прадаўжаюць шкодзіць у гэтым раёне. Хітра маскіруючыся яны ўваходзяць у лавер'е мясцовых кіруючых партыйных і совецкіх органаў, прабіраюцца ў совецкі апарат, кааперацыйныя і іншыя арганізацыі.

Кулакі і эсэры, якія пралезлі ў аямельныя органы, пры прамым патуранні партыйных арганізацый, актыўна ажыццяўлялі кулацкую палітыку. У рэзультаце значная частка населеных пунктаў раёна была разбіта на атрубы і хутары. Гэта прышчэпаўска-нацдэмаўская палітыка праводзілася ў раёне аж да 1936 года.

Але ці можна сказаць, што ў Горацкім раёне зараз усё добра, што там ўжо выкрыты і выкарчаваны да канца ўсе ворагі народу, эсэры, трацкісты, бухарынцы, подлыя агенты фашызма, шкоднікі і дыверсанты? Не, гэтага сказаць нельга.

У Горскім сельсавеце, на тэрыторыі якога яшчэ зусім нядаўна насаджаліся хутары, зараз арудуе шайка палітычных і крымінальных злачынцаў на чале з старшынёй сельсовета Васілёнкам і дырэктарам ільназавода Гутманам. Гэтыя людзі груба парушаюць сталінскі статут сельгасарцелі, распяваюць калгаснае дабро. У сельгасарцелі імя Сталіна, імя Дзем'яна Беднага і імя Куйбышэва Васілёнак шляхам жульніцкіх махінацый атрымлівае фураж, прадукты, нават воўну.

Дырэктар ільназавода Гутман прысвоіў 200 пудоў заводскай бульбы, забраў сабе за нізкую плату незаконна адабраную ў аднаасобніка карову.

Васілёнак акружыў сябе антысовецкай кампаніяй. Сакратаром у сельсовет ён узяў былога эсэра Шакунова, раззліў, пашага калгас «Новая Свабода», а сваім намеснікам зрабіў судзімага за антыкалгасныя справы Панамарова. Загадчыкам дома соцкультуры Васілёнак прызначыў выключанага з партыі трацкіста Лішнеўскага.

Палітычны твар Гутмана таксама сумніцельны. Гутман быў цесна звязан з трапкістам Мажэйка, з якім часта наведваў кватэру былога актыўнага эсэра Васпякова, слухаў там контррэволюцыйныя патэфонныя пласцінкі. Гэты-ж самы Гутман доўгі час утойваў контррэволюцыйныя выступленні былога дырэктара райзяржбанка Каплана і цяперашняга старшыні калгаса імя Куйбышэва Рашатнёва. Больш таго, Гутман, як парторг тэрытарыяльнай первічнай партарганізацыі, настойліва рэкамендаваў Рашатнёва комсоргам.

У Маслакоўскім сельсавеце таксама арудуе шайка злачынцаў. Старшыня сельсовета Пташкоў, яго намеснік Мігурскі і старшыня калгаса «Кэмінтэрн» Максімаў сістэматычна наладжваюць у памяшканні сельсовета п'яныя вечарынкі на сродкі калгасаў. У мэтах маскіроўкі сваёй шкодніцкай дзейнасці яны ўжываюць яўна жульніцкія махінацыі. Прэміруючы калгаснымі сродкамі пад маркай стахановаў сваіх прыяцеляў і самі сябе, яны потым пускаюць гэтыя «прэміі» на папойкі. Злачынцы расцягваюць калгаснае дабро і шляхам прамых узятак у калгасах.

Гэтая вграя шкоднікаў беспакарана здзекуецца над калгаснікамі і аднаасобнікамі. У многіх з іх яны незаконна забіраюць жывёлу і будынкі. У аднаасобніка вёскі Маслакі Неграбскага яны адабралі сядзібу з садам і далі яму другую без саду.

Пташкоў і Максімаў да таго абнаглелі ў сваёй варожай дзейнасці, што пачалі збіваць чэсных калгаснікаў.

Пра ўсё гэта ведаюць кіраўнікі раёна, але чамусьці маўчаць. Шмат сігналаў аб дзеяннях гэтых злачынцаў паступаюць у райком, райвыканком і пракуратуру, але там на іх не звяртаюць ніякай увагі.

У калгасе «XX МЮД», Рудакоўскага сельсовета, шайка прахадзімцаў — былых кулакоў і эсэраў на чале з папом Брацлевічам распаўсюджваюць сярод калгаснікаў рознага роду контррэволюцыйныя чуткі, накіраваныя на падрыў працоўнай дысцыпліны ў калгасе. Нядаўна поп распаўсюдзіў контррэволюцыйнае пісьмо, у якім запалохваў калгаснік пералётам «нябесных» птушак з доўгімі жалезнымі дзюбамі. Пасля гэтага многія калгаснікі не выйшлі на работу.

У праўленне гэтага калгаса пралезлі былы сельскі стараста кулак Канцавенка Нікіта і апякун бандытаў Скараходаў Іван. Маючы цесную сувязь з попам, яны пад яго кіраўніцтвам увесь час вядуць падрыўную работу ў калгасе. Ведаюць у раёне і аб гэтых справах, але таксама не надаюць ім ніякага значэння.

Нядаўна ў «Звяздзе» пісалася аб тым, што райком і яго сакратар т. Штэйнгарт праяўляюць нерашучасць у пытанні выкрыцця сапраўднага палітычнага твару дырэктара сельгасінстытута Пелікана. Такая-ж нерашучасць праяўляецца рэйкомам і ў адносінах цэлага раду іншых сумніцельных людзей.

Райком, напрыклад, не лічыць патрэбным заняцца глыбокай праверкай сапраўднага палітычнага твару інструктара райкома партыі т. Кушнярова, які, ведаючы аб контррэволюцыйнай вылазцы трацкіста Каплана, умаўчаў аб ёй на партыйным сходзе ў часе абмеркавання кандыдатуры Каплана ў члены райкома. Гэтыя надзвычайныя паводзіны т. Кушнярова былі расцэнены райкомам як простая «забыўлівасць».

Зусім глухі райком да сігналаў комуністаў, якія не раз сігналізавалі аб тым, што член райкома т. Янюўскі быў у свой час цесна звязан з выкрытым ворагам народу, арудаваўшым на пасадзе дырэктара соўгаса «Мацюты». Янюўскі часта гасціў у гэтага зорага, сістэматычна снабжаўся соўгаснымі прадуктамі, а ў пазняку за гэта ён пакрываў усе шкодніцка-варожыя дзеянні ў соўгасе.

Такая гніла-ліберальная, нерашучая пазіцыя Горацкага райкома і яго сакратара тав. Штэйнгарта ў справе выкарчоўвання ворагаў і іх шкодніцка-падрыўной дзейнасці не з'яўляецца выпадковай. Працоючы доўгі час сакратаром Капыльскага райкома партыі, тав. Штэйнгарт таксама пакрываў варожыя справы рознага роду пёмных асоб, былых эсэраў і беларгвардзейцаў, якія аказаліся потым польскімі шпіёнамі.

На пасадзе намесніка старшыні Капыльскага райвыканкома пры Штэйнгарце арудваў былы ўпраўляючы памешчыцкага маёнтка нейкі Здрайкоўскі. У райкоме партыі было шмат сігналаў аб варожай дзейнасці гэтага мярзотніка, але тав. Штэйнгарт утойваў гэтыя сігналы ад партыйнай арганізацыі. Больш таго, ён рэкамендаваў Здрайкоўскага старшынёй Грэскага райвыканкома.

Другім сакратаром Капыльскага райкома партыі пры Штэйнгарце працаваў адзін з актыўнейшых польскіх шпіёнаў, варожая дзейнасць якога таксама пакрывалася тав. Штэйнгартам. Штэйнгарт доўгі час трымаў на пасадзе інструктара райкома яго жонку, якая аказалася аферысткай.

Пакрываў тав. Штэйнгарт і трацкіста Меркіна. Апошні лічыўся ў тав. Штэйнгарта выдатным прапагандыстам. Ён ставіў яго ў прыклад другім прапагандыстам, у той час як было добра вядома, што Меркін яшчэ ў 1933 годзе выступаў з трацкісцкімі ўстаноўкамі.

І не выпадкова тав. Штэйнгарт карыстаўся асобай павагай у былога сакратара Слуцкага акругкома партыі. Сігналы комуністаў аб засмечанасці Капыльскай арганізацыі варожымі людзьмі, аб укрыцці тав. Штэйнгартам шкодніцкай дзейнасці варожых людзей таксама марнаваліся ў акругкоме. У сваю чаргу тав. Штэйнгарт усюды выступаў з хвалебнымі гімнамі па адрасу акруговага начальства. Падхалімству і ўгодніцтву з боку Штэйнгарта не было межаў.

Усё гэта патрабуе ад Горацкай партыйнай арганізацыі рашучай, большэвіцкай, бязлітаснай барацьбы за павышэнне рэвалюцыйнай пільнасці, барацьбы за ачыстку сваіх радоў ад усіх варожых людзей, якія, прыкрываючыся высокім званнем члена партыі і партыйным білетам, актыўна працуюць на карысць японска-германа-польскага фашызма, праводзячы ў раёне шкодніцка-падрыўную і шпіёнскую работу.

Р. ФРАЛОЎ.

Калгаснікі-веласіпедысты, калгас імя Леніна, Пакалюбіцкага сельсовета, Гомельскага раёна — удзельнікі прабегу па праверцы ўраджаю ў калгасах Гомельскага раёна. У час свайго 300-кіламетравага прабегу яны праводзілі культмасавую работу, дзяліліся вопытам работы лепшых калгасаў раёна. (БСФ).

ГЛЫБОКА ВЫВУЧАЦЬ ПАЛАЖЭННЕ АБ ВЫБАРАХ

Сталінскі горрайком за апошнія месяцы арганізаваў і правёў рад практычных мерапрыемстваў па ахопу працоўных раёна палітычнай агітацыяй у сувязі з падрыхтоўкай да выбараў у советы па новай Сталінскай Канстытуцыі.

Так, 11 жніўня ў Зялёным тэатры быў арганізаван даклад для хатніх гаспадынь і пенсіянераў аб выбарах у Вярхоўны Совет Саюза. Прысутнічала на гэтым сходзе паўтары тысячы чалавек. У заключэнне быў дан канцэрт і дэманстравалася кінокарціна.

На кожным прадпрыемстве і жакце створаны гурткі рабочых і служачых па вывучэнню палажэння аб выбарах. Такімі-ж гурткамі ахоплены і інтэрнаты некаторых фабрык і заводаў (фабрыка імя Крупскай і інш.). Кіраўнікамі гурткоў райком вылучыў 20 падрыхтаваных комуністаў. Апрача гэтага на прадпрыемствах і ўстановах агітатары праводзяць сярод рабочых і служачых чытку газеты «Правда» і інш.

На ўсіх прадпрыемствах раёна вывучаецца пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб аказанні дапамогі калгаснаму сялянству БССР і аб ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе калгаснага ўпарадкавання». Гэта падымае вытворчую актыўнасць кожнага працоўнага. Рабочыя горача вітаюць клопаты большэвіцкай партыі і таварыша Сталіна аб калгасным сялянстве.

18 ліпеня ў саду імя Горкага была арганізавана шматлюдная масоўка з удзелам 15 тысяч чалавек. Працоўныя ўважліва слухалі даклад аб галавіне гераічнай барацьбы іспанскага народу з фашысцкімі інтэрвентамі. Пасля дакладу ў садзе быў наладжан паказ мастацкай самадзейнасці сіламі тэатральных калектываў.

Горрайком намеціў план вучобы палітагітатараў. Праз курсы павінна прайсці 150 таварышоў. Першая чарга курсаў хутка распачне заняткі.

Сярод працоўных раёна наглядаецца вялікая цяга да ведання палітычных падзей. Гэта яскрава паказваюць праведзеныя мітынгі і сходы. Райком абавязан арганізаваць палітычную агітацыю так, каб ахапіць ёй усіх працоўных. Асабліва трэба звярнуць увагу на глыбокае і ўсебакоўе вывучэнне «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет Саюза ССР».

М. А.

НЕ ЗАЦЯГВАЦЬ РАМОНТУ ШКОЛ

Разлічваючы на значнае паляпшэнне школ, у Жлобінскім раёне павінны быць пабудаваны дзве новыя сярэднія школы, адна ў горадзе, другая ў Мормальскім сельсавеце.

Будаўніцтва гарадской сярэдняй школы патрабна было пачаць 1 красавіка і кончыць да новага навучальнага года. Але яно злачынна зацягваецца. Чым вытлумачыць такое станозішча? Нечым іншым як бясклопатнасцю загадчыка раёна Курдо, кіраўніцтва РВК, прараба будаўніцтва Рыбцова, якія не дбаюць аніякай адказнасці за будаўніцтва. Яшчэ зараз не закончана тынкаванне, не ўстаўлены вокны і шыбы, не распачата пабелка. Ні Курдо, ні Рыбцоў не падумалі аб тым, каб на будаўніцтве дабавіць людзей, асабліва тынкоўшчыкаў. Па іх словах, пабудова сярэдняй школы закончыцца толькі пасля 1 верасня. Пры гэтым патрэбна адзначыць, што рабочым несвоечасова выплочваецца зарплата, таму значная частка іх пакінула будаўніцтва. Не кончана будаўніцтва школы і ў Мормальскім сельсавеце.

У раёне зусім дрэнна кіруюць справай падрыхтоўкі школ да новага навучальнага года. Аб гэтым ярка гаворяць наступныя факты.

Капітальнага рамонту патрабуе неахкладна мяхоўская школа. Патрэбна пераслаць падлогу, зрабіць пабелку і інш. На гэта адпушчаны сродкі, але да рамонту не прыступілі.

«Мы ўжо раіліся, — гаворыць старшыня Бабоўскага сельсовета Савінкі, — і парашылі, што няма чаго спяшацца. Яшчэ хопіць часу».

Аналагічнае становішча і ў Сенажаткаўскім сельсавеце. Чарцежская школа амаль зусім развалілася. І гэта ніколькі не турбуе старшыню сельсовета Карунчыка і кіраўнікоў раёна.

Надзвычай зацягнут рамонт школ у Кабанаўскім і Чацвярынскім сельсаветах.

Да пачатку навучальнага года асталіся лічаныя дні, а ў Жлобіне нехапае 66 настаўнікаў, школы не забяспечаны апалам, не закончан рамонт і т. д.

Як відаць, школы раёна не гатовы яшчэ да навучальнага года.

ШЫБІНСКІ.

1.224,000 ЧАЛАВЕК ПАДПІСАЛАСЯ НА ПАЗЫКУ

Па даных кіраўніцтва ашчадкас БССР на 15 жніўня па рэспубліцы рэалізавана пазыкі ўмацавання абароны Саюза ССР на 103.263 тыс. рублёў. У радзе раёнаў і гарадоў значна перавышана мінулагодняя падпіска. Так, па Магілёўскаму раёну рэалізавана пазыкі на 5.622 тыс. рублёў супроць 5.010 тыс. рублёў у мінулым годзе. Перавысілі мінулагоднюю падпіску: Менскі, Мозырскі, Аршанскі і інш. раёны.

Па даных на 11 жніўня ў БССР падпісаліся на новую пазыку 546.387 рабочых і служачых і 678.052 калгаснікі.

У ВАЕННЫМ ТРЫБУНАЛЕ БВА

Органамі НКВД раскрыта шайка трацкісцка-правых шпіёнаў-дыверсантаў, якая, пранікнуўшы ў Н-скую часць, праявяла атручванне чырвонаармейцаў.

Ваенны трыбунал Беларускай Ваеннай Акругі, пад старшынствам дывізіёнюрыста тав. Мілянаўскага і членаў: брыгвоенюрыста тав. Сахарава і ваеннага юрыста 1-га ранга тав. Кедрава, у судовым пасяджэнні 15 жніўня г. г. разгледзеў справу ўдзельнікаў гэтай шайкі трацкісцка-правых шпіёнаў-дыверсантаў Томкава Т. А., Мадэстава М. Д., Семушына Г. А., Уварава В. А., Дзядзюшкіна П. М. і Цорна А. Ф.

Ваенны трыбунал устанавіў, што атручванне байцоў Н-скай часці было праведзена ўдзельнікамі гэтай дыверсійнай шайкі па заданнях фашысцкіх разведак.

Усе абвінавачваемыя віноўнымі сябе прызналі.

Ваенны трыбунал прыгаварыў усіх дыверсантаў-шпіёнаў — Томкава Т. А., Мадэстава М. Д., Семушына Г. А., Уварава В. А., Дзядзюшкіна П. М. і Цорна А. Ф. — да расстрэлу.

Прыгавор прыведзен у выкананне.

Цкаванне стаханаўца

Я інвалід грамадзянскай вайны і інвалід працы. Атрымліваю пенсію. Не гледзячы на гэта я не пакінуў прапавацъ у арцелі інвалідаў «Чэлюскінец» (Менск). Мой вытворчы стаж — 33 гады. Гэта пісьмо я быў вымушан напісаць таму, што ў апошні час у арцелі некаторыя варожыя элементы літаральна здзекуюцца з мяне.

Я з'явіўся ініцыятарам стаханаўскага руху ў арцелі. На працягу ўсёй сваёй работы выконваю па дзве і больш нормы. Некалькі разоў прэміравалі. У гэтым годзе нават паслалі на курорт, хоць і тут не абышлося без здзекаў: па віне старшыні страхкасы Скалабава і старшыні арцелі Шманаева мне не выдалі грошай на дарогу.

У апошні час з мэтай кампраметацыі мяне, як стаханаўца, і паніжэння маёй выпрацоўкі кіраўнікі арцелі пачалі перакідваць мяне з адной работы на другую, дзе бываюць значныя прастоі. У выніку за два тыдні мой заработак панізіўся на 200 рублёў. Для таго, каб утоіць сляды злачынства, брыгадзір Левін разам з членам партыі Шэвах падсунулі мне для подпісу загадзя напісаную заяву аб тым, нібы я сам прашу перакідвання з работы на работу.

Здзекі пачынаюць пераходзіць усе межы. Тыдні паўтары таму назад нейчая зарожая рука паставіла каля маёй машыны замест бутэлькі з маслам для змазкі машыны бутэльку з мачой.

Не гледзячы на тое, што ў мяне 9 душ сям'і — у дзіцячыя лагеры паслалі толькі адно маё дзіця, а ў гэты час у нестаханаўца Левіна, які мае чатыры вымовы, паслалі двое дзяцей.

Каб знізіць паказальнікі маёй выпрацоўкі, мне на працягу трох месяцаў не аплачваюць за зробленыя 5 пар ботаў.

У арцелі шмат агіднасцей. Пасля палучкі кожны раз у цэху наладжваецца карцёжная ігра, якая пераносіцца потым на кватэру да члена партыі Шэваха.

Калі я пра ўсе агіднасці напісаў у газету, мне брыгадзір Левін і выключаны з партыі Ярушэвіч сталі пагражаць расправай. Характэрна, што Бракалаў, які часта карыстаецца паслугамі кіраўнікоў арцелі, атрымліваючы ад іх розны абутак, пастараўся выгаварадзіць іх і замест пакарання вінаватых настойваў на тым, каб мне даць вымову за тое, што я... позна выкрыў агіднасці ў арцелі. Такім чынам я з абвінаваўцы ператварыўся ў абвінавачваемага.

Праўда, агульны сход не згадзіўся даць мне вымову, але праследаванне ўсё-ж прадаўжаецца і да гэтага часу. Мяне пазбавілі звання стаханаўца, маю фатаграфію назаўтра-ж знялі з вітрыны стаханаўцаў, а сапраўдныя віноўнікі не пакараны.

Прашу «Звязду» ўмяшацца ў гэту справу і дапамагчы аздаравіць атмасферу ў арцелі «Чэлюскінец».

ГАРДОН І. — рабочы арцелі інвалідаў «Чэлюскінец».

Твар „настаўніка" Баркова

У глускай раённай газеце «Сцяг калектывізацыі» за 13 мая г. г. была змешчана заметка за подпісам сямі вучняў пад назвай: «Трацкісцкі паследыш Баркоў арудуе». У заметцы ішла гутарка аб выкладчыку гісторыі гапкай НСШ Р. М. Баркову. Прыводзячы цэлы рад фактаў, вучні выкрывалі Баркова, як выклікаючага палазрэнне і працягваючага варожую дзейнасць у школе.

Сігналы аб дзейнасці Баркова былі і ў райкоме партыі, і ў райана — яшчэ да змяшчэння заметкі ў раённай газеце. У школу некалькі разоў прыязджаў інструктар райкома партыі Пракопчык, правяраў факты, але мер ніякіх не прымалася. Таксама прыязджаў у школу і загадчык райана Шыловіч. Яго прыезды не змянілі становішча, Шыловіч пакрываў Баркова. 23 чэрвеня на нарадзе дырэктароў і загадчыкаў школ раёна Шыловіч на заданае пытанне адносна Баркова зусім не адказаў.

Хто-ж такі Баркоў? У 1935 годзе ён выключан з партыі за трацкісцкія справы. Адзін сваяк Баркова выслан органамі НКВД. Другі сваяк служыў у бандах Балаховіча і забіт у часе ліквідацыі гэтых банд. Баркоў дагэтуль трымае сувязь з антысовецкімі элементамі.

Мінулае і сённяшняе Баркова добра вядома кіруючым работнікам раёна. Але пакрывацельства яго стала зусім відавочным фактам. У 1936 годзе Баркоў без іспытаў прынят на 1 курс завочнага геаграфічнага аддзялення МПІ па нейкіх даведках раёна і райкома саюза.

Адзін з пакрывацеляў Баркова дырэктар школы Сечко—заядлы падхалім, дабіўся ад раённых кіраўнікоў павагі за хлуслівыя рапарты. Так, ён на нарадзе дырэктароў і загадчыкаў школ раёна аўтарытэтна заявіў, што «па гацкай НСШ усяго 13 прод. другагодніцтва». А на справе ў адным 7-м класе з 27 вучняў толькі 10 скончылі школу, а 17 вучняў не выпушчаны са школы, у тым ліку пяць вучняў—піянераў і комсамольцаў—пакінуты на другі год за тое, што яны пісалі аб агідных справах Баркова ў раённую газету.

Так у Глуску патураюць ворагам і іх шкодніцкай дзейнасці. Неабходна зараз-жа пакласці гэтаму канец і прыцягнуць да адказнасці і тых хто пакрывае ворагаў.

А. ШЭЙКА.

Бяздушныя адносіны да настаўніцы

Я пяць год працую настаўніцай у Грабянёўскім сельсавеце, Лельчыцкага раёна, і два апошнія гады працавала ў вараноўскай пачатковай школе. Пры гэтай школе была арганізавана школа малапісьменных у колькасці 34 чалавек.

У канцы навучальнага года з гэтай школы выпушчана 28 слухачоў, за што Грабянёўскі сельсавет павінен быў выплаціць мне па 8 рублёў за кожнага слухача. Але старшыня сельсовета не хоча выплачваць. Таксама ён не выплаціў мне зарплату за снежань 1936 года, люты і сакавік г. г., а таксама па рахунках на суму ў 70 рублёў.

Да старшыні сельсовета Іванова я многа раз звярталася, каб атрымаць належачыя мне грошы, але ўсё гэта дарэмна. У яго толькі адзін адказ: «Пачакайце, выплацім, яшчэ паспееце». І так гэта свядомая валакіта Іванова пягнецца доўгі час. Я магла-б яшчэ пачакаць, але я хворая і нават знаходжуся ў вельмі цяжкім становішчы. Па маёй хваробе мне патрэбна было даўно быць у больніцы, але ў мяне няма грошай, а самадур старшыня сельсовета Іваноў здзекуецца з мяне. Я лічу, што за такія бяздушныя адносіны да мяне самадур Іваноў павінен быць прыцягнут да адказнасці.

Р. КАЗАКОВІЧ.

НАРКАМСАБЕЗ ЗАСМЕЧАН ВОРАГАМІ

Да 70 тысяч грамадзян знаходзяцца на ўтрыманні Наркамсабеза БССР: інваліды працы, вайны, дзеці, згубіўшыя бацькоў, персанальныя пенсіянеры і людзі, часова згубіўшыя працаздольнасць.

Як-жа абслугоўваюць іх органы соцыяльнага забеспячэння? Скаргі, паступаючыя ў рэдакцыю «Звязды», гаворяць аб тым, што ў Наркамсабезе не ўсё добра.

У сістэму Наркамсабеза ўваходзяць некалькі сот вытворчых аддзілак, якія раскіданы па ўсёй БССР. У першую чаргу гэтыя прадпрыемствы закліканы для таго, каб даць магчымасць інвалідам набыць кваліфікацыю. Але кіраўнікі гэтых арцеляў пры прамой падтрымцы наркома т. Ашака ўсімі сіламі і сродкамі гэтага пазбягаюць, кажучы, што нашы прадпрыемствы на гаспадарчым разліку, а таму нам няма часу займацца кваліфікацыяй інвалідаў. У рэзультаце план працаўстройства інвалідаў на 1937 год амаль сарван.

У арцелях пад выглядам інвалідаў прапікла многа розных прахадзімцаў, а інваліды, якія сапраўды адчуваюць патрэбу ў матэрыяльным забеспячэнні і ў падняцці сваёй кваліфікацыі, усімі мерамі выжываліся.

Аб усіх гэтых шкодных дзеяннях кіраўнікоў арцеляў гаворяць шматлікія факты, сігналы, якія ляжаць пад спудам у наркома т. Ашака. Лічбы гэтых актаў паказваюць жудасную дзейнасць прабраўшыхся ў арцелі і там творачых беспакарана свае дыверсійныя акты ворагаў народу: трацкістаў, бухарынцаў, польскіх шпіёнаў.

Больш таго, сігналы «Звязды» паказвалі, што і ў сістэме Наркамсабеза і ў Белкаапінсаюзе не ўсё добра, што там арудуюць ворагі, а ў гэтым Ашак займае «нейтралітэт».

Ці выпадкова гэта? Не, не выпадкова. У самога т. Ашака, як кажуць, «рыльца ў пуху».

Яшчэ ў студзені г. г. на імя т. Ашака паступалі шматлікія заявы аб кіраўніцтве Белкаапінсаюза. Ашак для бачнасці стварае камісію па абследванню ўсіх гэтых сігналаў. Пішацца акт. Шэрман і Львовіч атрымліваюць ад наркома прэмію ў размеры 2.000 руб.

Рабочыя інваліды члены партыі і беспартыйныя ўпарта пішуць, сігналізуюць у партыйныя арганізацыі аб тым, што ў Наркамсабезе і Белкаапінсаюзе не ўсё добра. Нарэшце Кагановіцкі рэйком выдзяляе камісію, у якую ўвайшоў і тав. Ашак.

Гэта камісія ўскрыла яшчэ ў студзені, маі месяцах рад агіднасцей, іх носьбітаў. Але чамусьці гэтыя вынікі не ўбачылі сэятла, і ворагі беспакарана яшчэ доўгі час арудвалі ў сістэме Белкаапінсаюза.

Апрача прадпрыемстваў у падпарадкванні Наркамсабеза ёсць каля 18 дамоў інвалідаў, у якіх пануюць нечалавечыя адносіны да людзей. У гэтых дамах у якасці выхавацаў часта сядзяць усякія жулікі, прахадзімцы, варожыя нам людзі.

Так, напрыклад, у чэрвеньскім дзіцячым інвалідным доме арудуе зграя шкоднікаў, якую ўзначальвае дырэктар гэтага дома Мудрэйка. У яго групу ўваходзіць загадчык гаспадаркі Малезіч, выхавацель былы афіцэр. Гэтая кампанія па-шкодніцку знішчыла 11 кароў, разбурыла гаспадарку, распрадала за бясцэнак жывёлу. На ўсякаму поваду тут наладжваюцца банкеты.

Выхаванне дзяцей у гэтым доме аддана на водкуп людзям несвядомым, непісьменным, Выхавацелі дзяцей з'яўляюцца: жонка Мудрэйкі, жонка Малевіча, у арсенале якіх апрача крыкаў, збіенняў дзяцей нічога няма. Гэтыя «выхавацелі» нават замкнулі ў сыры склеп малое дзіця, якое сядзела там суткі.

Аб усіх гэтых фактах тав. Ашак добра ведае, бо ён там з'яўляецца частым госцем. У гонар гэтага госця наладжваюцца папойкі, у якіх прымаюць удзел усё кіраўніцтва гэтага дома, сакратар райкома Касцюкевіч і іншыя адказныя раённыя работнікі.

Цяпер стане зразумелым, чаму гэтыя шкодныя факты пакрываюцца Наркамсабезам і чаму так часта Мудрэйка пасылаецца тав. Ашаком на курорты абавязкова з вялікай сумай грошай на «дарогу». Мудрэйка ў сваю чаргу не астаецца ў даўгу тав. Ашаку, — пасылае яму з Чэрвеня дровы, палкідвае тое-сёе з прадуктаў.

Тут-жа, у Чэрвені, ёсць дом прастарэлых, які таксама засмечан ворагамі народу. Так, напрыклад, на чале гэтага дома стаіць нехта Крыштапанец, выключаны з партыі за трацкізм. Як зараз высвятляецца, ён моцна звязан са шпіёнамі. У гэтым доме пад яго апякунствам знаходзіцца шпіён Карлаў, які ў 1926 годзе хадзіў у Польшчу, але быў злоўлен і выслан у аддалёныя мясцовасці. Адтуль уцёк і зараз жыве ў гэтым доме.

Знайшоў сабе прытулак у гэтым доме нехта Камоцкі, дваранін, звязан з Польшчай. І не дзіва пасля гэтага, што ў гэтым доме праводзіцца сярод прастарэлых інвалідаў антысовецкая контррэволюцыйная работа.

Не лепш стаіць справа і ў Селюпінскім доме інвалідаў. Там тав. Ашак таксама з'яўляецца частым госцем. На чале гэтага дома стаіць нехта Каляда, добры знаёмы Ашака. Гэты Каляда ў мінулым меншавік. У гэтым доме пры прамым падтрыманні і ўказанню Каляды збіваюць інвалідаў. Так было з актыўным удзельнікам грамадзянскай вайны тав. Станішэўскім, якога сам Каляда не раз збіваў, звязваў яго, звязаўшы зноў збівалі, зучыў і другіх збіваць тав. Станішэўскага. Каляда толькі папяраджваў: «бійце, хлопцы, толькі не рабіце сінякоў» і збівалі да непрытомнасці.

Гэты дзяржыморда зацiскаў крытыку, ператварыў дом у антысовецкі ачаг. За мэлейшыя правіннасці тут збівалі, здзекаваліся і не давалі гаварыць. Прадукты разбазарваліся, растранжыраваліся дзяржаўныя грошы на розныя банкеты, наладжваліся па прыездзе Ашака п'янкі і т. д.

Абслугоўваючы штат гэтага дома таксама быў падабраны па «образу и подобию» самога дырэктара. Бухгалтар Кудраўцоў, загадчык гаспадаркі Самонскі — прахадзімцы, п'яніцы—таксама здзекваліся над інвалідамі, збівалі іх і трымалі ў пакорлівасці да сябе. Гэта зграя давала дом да такога станозішча, што адзін інвалід-рабочы пакончыў жыццё самагубствам.

Усе гэтыя злачынствы вядомы т. Ашаку, але ён іх пакрывае, як пакрывае і агіднасці іншых дамоў.

Тав. Ашак прыяцель Мадрэйкі, Каляды, Крыштапанца—земляка іх па Латвіі. Яны даўно спеліся паміж сабою і беспакарана праводзяць сваю шкодную работу.

На ўтрыманні Наркамсабеза знаходзіцца 465 персанальных пенсіянераў. Дзяржава траціць на іх каля 100 тыс. рублёў. Хто гэтыя пенсіянеры? Ці законна яны атрымліваюць пенсію? Тав. Ашак аб гэтым не хоча думаць. Самае беглае азнаямленне з кадрамі пенсіянераў паказвае, што тут нямала людзей, якія беспадстаўна атрымліваюць пенсію. Сярод іх ёсць такія пенсіянеры, якія атрымліваюць па рэкамендацыі ворагаў народу. Сярод іх ёсць польскія шпіёны, якія незаконна атрымлівалі пенсію і пасля іх арышту. Жонка аднаго з гэтых шпіёнаў нядаўна атрымала пуцёўку на курорт, ды ў прыдачу да яе 2.000 руб. дапамогі.

Ашак быў цесна звязан з адным з іх. Разам з ім ён на працягу трох год трымаў дачу, прымаў удзел у арганізаваных ім папойках, розных гульнях і т. д.

Выдаецца персанальная пенсія нейкаму Лахмачову (яго сапраўднае прозвішча Васіленка). Гэты Лахмачоў-Васіленка быў на Украіне асуджан, а зараз па чужому дакументу лічыцца партызанам і атрымлівае ў тав. Ашака розныя дапамогі: пуцёўкі ў дамы адпачынку, курорты, грашовую дапамогу і т. д. У Магілеве жыве нейкі Дальнікаў, якога тав. Ашак за кошт дзяржазы падкармлівае. Выдае яму штомесячна 125 руб., штогодна пасылае на курорт. Калі тав. Ашаку пярэчылі і ўказвалі на тое, што Дальнікаў няправільна атрымлівае пенсію, то тав. Ашак заўсёды гаварыў: «Гэта-ж стары рэволюцыянер, яго трэба падтрымліваць». На самой-жа справе ўся «рэволюцыйнасць» Дальнікава заключаецца ў тым, што ў яго на кватэры ў 1905 годзе ў Варшаве быў штаб контррэволюцыйнага бунда.

Гэта далёка няпоўны спіс «персанальных пенсіянераў», якія праз тав. Ашака, пры яго непасрэдным удзеле падкармліваюцца за кошт дзяржавы.

Дзеянні тав. Ашака стануць больш яснымі, калі сказаць яшчэ аб тым, што тав. Ашак быў моцна звязан з ворагамі народу, польскімі шпіёнамі, якія прабраліся на кіруючыя пасты ў Беларусі. Ён выконваў іх загады і ў быту ён быў у іх сваім чалавекам. Гэта зграя забіралася ў рыбсоўгас «Вольма», Смалявіцкага раёна, і, зразумела, займалася не лоўляй рыбы.

Па распараджэнню тав. Ашака чацвертая арцель зрабіла дорага каштуючую мэблю, ложкі, шторы. Але гэтыя рэчы не паспелі забраць ворагі народу, і «зараз загадчык гэтай арцелі часта раіцца з тав. Ашаком «што рабіць», бо ўкладзены ў гэтыя рэчы велізарныя сродкі, у якіх арцель мае вялікую патрэбу. Але тав. Ашак супакойвае яго, кажучы — не турбуйся, знойдуцца пакупнікі. Заказваліся па сабекошту розныя касцюмы, абутак і ўсё гэта рабілася за кошт дзяржавы, пад відам прэміі, падарункаў і т. д.

Наркамсабезу дзяржавай даручаны клопаты аб дзесятках тысяч грамадзян, якія адчуваюць патрэбу ў соцыяльным забеспячэнні. Кіраўнікі наркамата абавязаны былі арганізаваць справу так, каб цэнтральныя і мясцовы апарат складаўся з палітычна праверанных людзей. Але яго скарысталі ворагі для сваіх контррэволюцыйных мэт.

Да рэчы, у апараце Наркамсабеза, у такім важным аддзеле, як аддзеле пенсіі працуе загадчыкам Адам, былы бундавец, выключаны з партыі. Гэта яму даручана тав. Ашаком распараджацца дзяржаўнымі сродкамі і даваць іх таму, каму непатрэбна. Гэта ён ужо больш двух месяцаў затрымлівае інваліду, старому чэкісту тав. Розіну адначасовую дапамогу і павелічэнне пенсіі, якая яму была вызначана па прамому распараджэнню наркома НКВД тав. Ежова, але і гэта распараджэнне ўпарта не выконваецца.

У прыёмнай Наркамсабеза працуе нейкі Ломскі, які выключаўся з партыі.

Санеў, выключаны з партыі за сувязь з трацкістамі, працуе інструктарам па праверцы становішча інвалідных арцеляў па раёну, і таму няма чаго здзіўляцца, што факты дзеяннаў ворагаў народу ў арцелях ім наўмысла захоўваліся.

Кузняцоў, выключаны з партыі як разлажыўшыйся элемент, працуе кансультантам прыёмнай Наркамсабеза, старшым эканамістам працуе Рашал — сын равіна і рад інш.

Пара парткому, Кагановіцкаму райкому, а таксама і СНК паглядзець глыбей у тое, што адбываецца ў Наркамсабезе.

Пара з усіх гэтых фактаў зрабіць большэвіцкія вывады і ачысціць Наркамсабез ад усіх ворагаў, якія творяць свае агідныя контррэволюцыйныя справы.

ЕРШОЎ.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ЦЭНТРАЛЬНЫ ФРОНТ

Як перадае агенцтва Гавас, у раёне Гвадалахары мяцежнікі атакавалі пазіцыі рэспубліканцаў, але былі адкінуты агнём і контратакай рэспубліканцаў. Рэспубліканскія батарэі падвергілі інтэнсіўнаму абстрэлу тыл праціўніка.

У сектары на поўнач ад ракі Тахо ў раёне Доунбеніто артылерыя рэспубліканцаў бамбардыравала пазіцыі мяцежнікаў у вёсцы Вільяр дэ Рэна, а таксама поезд, які накіроўваўся з Талаверы на мадрыдскі фронт.

На ўчастку Аньовер дэ Тахо была чутна ўзмоцненая перастрэлка ў лагеры мяцежнікаў. На старану рэспубліканцаў перайшлі тры перабежчыкі з войск праціўніка.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Згодна паведамленню міністэрства абароны, апублікаванаму 14 жніўня, на радзе ўчасткаў паўночнага фронта мяцежнікі прадпрынялі атакі, падтрыманыя авіяцыяй і артылерыяй.

Паводле вестак агенцтва Эспань, 13 жніўня 6 трохматорных самалётаў мяцежнікаў у суправаджэнні знішчальнікаў зрабілі налёт на Сантандэр. Фашысцкія самалёты скінулі некалькі бомб, якія ранілі 18 чалавек і разбурылі некалькі дамоў. У рэзультаце дзеянняў рэспубліканскіх знішчальнікаў фашысцкія самалёты былі вымушаны спыніць бамбардыроўку і ўцякаць.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

Мяцежнікі абстрэльвалі пазіцыі рэспубліканцаў у Пітрэс і бамбардыравалі вёску Лопера.

Новае пагадненне аб адзінстве дзеянняў паміж комуністычнай і соцыялістычнай партыямі Італіі

ПАРЫЖ, 14 жніўня. (БЕЛТА). Італьянская антыфашысцкая газета «Воче Дэлы Італіані», якая выходзіць у Парыжы, паведамляе, што 26 ліпеня ў Парыжы заключана новае пагадненне аб адзінстве дзеянняў паміж італьянскімі комуністычнай і соцыялістычнай партыямі.

Новае пагадненне пераносіць цэнтр антыфашысцкай барацьбы комуністычнай і соцыялістычнай партый у самую Італію, устанаўліваючы агульныя для абодвух партый мэты і задачы.

Абедзве партыі заклікаюць да аб'яднання ўсіх антыфашысцкіх арганізацый, якія існуюць у Італіі і ў эміграцыі, і ставяць пытанне аб стварэнні італьянскага народнага фронта.

У пытаннях міжнароднай палітыкі таксама дасягнута пагадненне. Абедзве партыі абавязваюцца аказваць безагаворачнае падтрыманне рэспубліканскай Іспаніі, весці сумесную барацьбу ў абарону Совецкага Саюза.

ПАЎСТАННІ Ў ВОЙСКАХ МЯЦЕЖНІКАЎ

ПАРЫЖ, 14 жніўня. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Гавас, 13 жніўня з перадавых пастоў рэспубліканцаў на фронце Леона (Іспанія) было заўважана шмат фашысцкіх самалётаў, якія скінулі на аэрадром мяцежнікаў 18 бомб і затым бамбардыравалі аэрадром мяцежнікаў у Вірхен дэль Камінo, а таксама радыётэлефонную станцыю горада Леон. Ва многіх пунктах на тэрыторыі мяцежнікаў узніклі пажары. Зенітныя батарэі горада Леон адкрылі моцны агонь па самалётах, якія, закончыўшы бамбардыроўку, прызямліліся на аэрадроме ў г. Валенсія дэ Дон Хуан (на паўднёвы ўсход ад г. Леон).

Згодна маючыхся вестак, бамбардыроўка была выклікана паўстаннем некаторых часцей гарнізона мяцежнікаў у Леоне, якія адмовіліся адправіцца на мадрыдскі фронт.

* * *

ВАЛЕНСІЯ, 14 жніўня. (БЕЛТА). Згодна паведамленню міністэрства абароны, мяцежнікі, каб падавіць паўстанне рабочых, захваціўшых цукарны завод у Матрыле, вымушаны былі сканцэнтраваць войскі вакол горада. Паўстанне адбылося таксама ў вёсках Каратаунас і Ланхарон. У паўстанні ў Грэнадзе прымалі ўдзел мараканцы, два батальёны палка «кароны» і штурмавая гвардзія.

На гвадалахарскім фронце каля Торэквадрыля чулася ўчора бамбардыроўка ў фашысцкім тылу.

3 жніўня ў Тэтуане адбылася сутычка паміж фалангістамі і ваеннымі. 5 фалангістаў і 3 ваенныя ранены.

ВЫКРЫЦЦЁ ШПІЁНСКІХ ЦЭНТРАЎ

ВАЛЕНСІЯ, 15 жніўня. (БЕЛТА). Мадрыдская паліцыя раскрыла два вялікія шпіёнскія цэнтры мяцежнікаў. Адзін цэнтр складаўся з відных дзеячоў іспанскай фалангі і іншых правых і фашысцкіх партый, а таксама членаў розных рэлігійных арганізацый. Усе яны праніклі ў батальён хімічнай службы рэспубліканскай арміі на цэнтральным фронце і займаліся шпіянажам. Арыштавана 40 чалавек.

На справе другога шпіёнскага цэнтра арыштавана 29 чалавек.

* * *

ВАЛЕНСІЯ, 14 жніўня. (БЕЛТА). Барселонская паліцыя арыштавала двух жанчын — германскіх падданых, у якіх знойдзены вялікія сумы ў замежнай валюце і шыфраваныя дакументы. Арыштаваныя служылі сувязістамі ў германскай разведцы.

ДАПРЫЗЫЎНАЯ ПАДРЫХТОЎКА МОЛАДЗІ Ў ІСПАНІІ

ПАРЫЖ, 14 жніўня. (БЕЛТА). У Валенсіі апублікаван дэкрэт міністра абароны, згодна якога ў рэспубліканскай Іспаніі ўводзіцца абавязковая дапрызыўная падрыхтоўка для моладзі ва ўзросце ад 18 да 20 год. Тэрмін дапрызыўнай падрыхтоўкі — ад 3 да 6 месяцаў штогодна.

НЕДАХОП ХЛЕБА Ў ГЕРМАНІІ

ВАРШАВА, 14 жніўня. (БЕЛТА). Газета «Палонія» ўказвае, што ў Германіі к вясне 1937 года запасы збожжа мінулых год ужо палкам зышлі, і ўрад быў вымушан да збору новага ўраджаю прывезці з-за граніцы 700 тысяч тон пшаніцы і 578 тысяч тон кукурузы. Адзначаючы дрэнны ў гэтым годзе ўраджай у Германіі, газета ўказвае, што прадстаіць далейшае скарачэнне забеспячэння германскага насельніцтва хлебам.

Характарызуючы становішча сялян, газета піша, што пасля чатырох год улады фашыстаў германскі селянін «страціў сваю палітычную і эканамічную незалежнасць і апынуўся ў рабскім стане».

У менскім Доме Чырвонай Арміі імя маршала Совецкага Саюза К. Е. Варашылава адкрыта выстаўка работ маскоўскіх мастакоў. НА ЗДЫМКУ: злева легендарны герой Шчорс — работа мастака Васільева; справа Герой Совецкага Саюза О. Ю. Шмідт — работа мастака Паўлава. Фото С. Грына.

РЫХТУЮЦЦА ДА ПРЫЗЫВУ Ў РСЧА

Пісьменнае і добра падрыхтаванае папаўненне дасць у бягучым годзе Бабруйскі раён Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Сярод прызыўнікаў горада і раёна няма ні аднаго непісьменнага. Трэцяя частка прызыўнікаў — варашылаўскія стралкі, здалі нормы на значок ГПА першай ступені.

Сярод калектываў горада першае месца па падрыхтоўцы да прызыву належыць дрэваапрацоўчаму камбінату. Сярод прызыўнікаў камбіната многа стаханаўцаў. Прызыўнік тав. Кліменкоў — стахановец станкавы дрэваапрацоўчага цэха № 2 злаў норму на варашылаўскага стралка другой ступені. Стахановец Агафонаў заканчвае без адрыву ад вытворчасці школу пілотаў. Старшы электрамашынёр лесапэха № 1 Сямёнаў — варашылаўскі стралок другой ступені і значкіст ГПА, заняў першае месца сярод прызыўнікаў камбіната па паспяховасці ў палітвучобе. (БЕЛТА).

ПЕРШЫ СОВЕЦКІ ВЕЛАТУР

12 жніўня ў Маскве быў дан старт 129 удзельнікам першага совецкага велатуру, які арганізаван па тыпу вядомых дарожных велагонак вакол Францыі — «Тур дэ Франс». Совецкі велатур праводзіцца па маршруту Масква—Кіеў—Менск—Масква агульнай працягласцю звыш 2.500 кілометраў. Увесь шлях разбіт на 14 этапаў. Значная частка маршруту пралягае па тэрыторыі БССР. Граніцу паміж УССР і БССР гоншчыкі перасякуць 19 жніўня. Яны спыняцца на начлег у Гомелі. У Менск яны прыбудуць 21 жніўня.

Ад БССР у гонках прымаюць удзел два пераможцы «Беларускага велатуру» мінчане Барыс Бальшакоў («Дынамо») і Віктар Левін («Спартак»), а таксама браты Міхаіл і Нікалай Рапапорты, Максімаў, Аграновіч, Гольдберг, Вішнеўскі, Карнілаў і Жараў.

Па атрыманых учора вестках лідэрам турa на гоначных машынах з'яўляецца пераможца украінскага велатуру, ордэнаносец тав. Рыбальчэнка («Дынамо»), а на дарожных — харкаўскі спартакавец Букрэеў.

Бальшакоў, не гледзячы на тое, што меў рад аварый, ідзе добра. Другі і трэці этапы Тула—Орол (180 кілометраў) і Орол—Сеўск (160 кілометраў) ён закончыў упераадзе чэмпіёна Саюза Дзенісава і такіх вядомых у Саюзе велагоншчыкаў, як Тарачкоў, Леонаў, Ерохін, Назараў і інш. У трэцім этапе добра прайшоў на дарожнай машыне менскі спартакавец Вішнеўскі, які фінішыраваў трэцім.

УДЗЕЛЬНІКІ ПЕШАГА ПЕРАХОДУ МЕНСК—КІЕЎ У БАБРУЙСКУ

14 жніўня ў Бабруйск прыбылі рабочыя менскай шведкай фабрыкі «Кастрычнік» — удзельнікі пешага пераходу ў працівагазах і процівіпрытных камбінезонах па маршруту Менск—Кіеў. Яны былі пёкла сустрэты працоўнымі горада. Адбыўся кароткі мітынг. Удзельнікаў вылатнага пераходу — ударнікаў абаронная работы зіталі прадстаўнікі райкома КП(б)Б і рабочых прадпрыемстваў. З адказным словам выступіла тав. Еўсюпіна. Яна заявіла, што ўсе ўдзельнікі пераходу адчуваюць сябе вельмі добра і ўпэўнены ў тым, што пастаўленая задача будзе імі з гонарам выканана.

Вечарам у садзе рабочых-шведнікаў была наладжана вялікая масоўка з удзелам гасцей.

15 жніўня ўдзельнікі пераходу адпачываюць у Бабруйску.

СПАРТЫЎНАЯ ХРОНІКА

Розыгрыш дзіцячых футбольных каманд на гарадское пяршынства. З 13 па 20 жніўня на Усебеларускім стадыёне праводзіцца розыгрыш дзіцячых футбольных каманд на гарадское пяршынства.

У розыгрышы прымаюць удзел каманды завода імя Кірава, дзве каманды Палаца піонераў і акцябрат, дзіцячыя каманды таварыстваў «Тэмп», «КІМ», «Харчавік» і Н-скай часці.

Камандзе, заняўшай пяршынства ў розыгрышы, будзе ўручан пераходны спят.

Устаноўлена 7 усебеларускіх рэкордаў. Закончыліся ўсебеларускія лёгкаатлетычныя спаборніцтвы. Звыш 100 чалавек з розных гарадоў і раёнаў БССР прымалі ўдзел у бегу, прыжках, мятанні і хадзьбе. На гэтых спаборніцтвах устаноўлена 7 усебеларускіх рэкордаў.

Члены таварыства «Харчавік» (Менск) Лобін за 1 мін. 0,9 сек. прабег з бар'ерам 400 метраў, а Барабаншчыкаў за 4 мін. 19,05 сек. прабег 1500 метраў. Калгасніца калгаса «Чырвоныя Скарынічы» Менскага раёна Лавецкая за 14 сек. прабегла з бар'ерам 80 метраў, а Рапапорт за 16,3 сек. прабег з бар'ерам 110 метраў.

МЕТАДЫ САМАСТРАХОЎШЧЫКА

Заклятыя ворагі народу, арудваўшыя ў Дзяржбанку СССР, не мала папрацавалі над тым, каб расставіць сваіх агентаў на перыферыі і праз іх падрываць фінансаванне нашай народнай гаспадаркі.

У сістэме Дзяржбанка па БССР да гэтага часу яшчэ не выкарчаваны рэшткі шкодніцтва, не ачышчан апарат ад чужых варожых элементаў.

У сістэме працягваецца шкодніцкае раскрадванне і разбазарванне дзяржаўных сродкаў. У шклоўскім аддзяленні Дзяржбанка расхішчана 4.000 рублёў і дагэтуль вінаватыя «не знойдзены». Такія-ж факты ёсць ў Полацку, Чэрвені, Гарадоцкае аддзяленне Дзяржбанка ставіла не раз перад Беларускай канторай пытанне аб варожай рабоце ў райзагу, аб развале работы райсаюза, аб стратах і злоўжываннях у Заготжывёле. Усё гэта астаецца без рэагавання, калі не лічыць фармальныя адпіскі.

У Беларускую кантору Дзяржбанка паступалі сігналы аб тым, што чэрвеньскае аддзяленне банка засмечана чужымі элементам, бундаўцамі, вымагальнікамі, хабарнікамі. Але ніякіх мер да ачысткі апарата не прынята.

У самім апараце Беларускай канторы Дзяржбанка засталіся яшчэ ворагі. Нядаўна тут пад выглядам знішчэння партрэтаў ворагаў народу спалілі партрэт аднаго з кіраўнікоў Чырвонай арміі. Гэты гнусны ўчынак партком Дзяржбанка (сакратар Жукоўскі) разам з кіраўніком Белканторы Казадоем пасцялілі замазаць і скрыць.

Як-жа Казадой змагаецца за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва? Ён хвастаецца тым, што за апошні час зволіў з апарата палы рад работнікаў. Але варта толькі бліжэй прыглядзецца да метаду, якім Казадой «ліквідуе» вынікі шкодніцтва, каб пераканацца, што па сутнасці ў банку груба скажаюць рашэнні Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б). Барацьбу за сапраўднае ачышчэнне апарата ад ворагаў і іх стаўленікаў тут падмяняюць агульным ахайваннем совецкіх кадраў, а зачастую прамымі адзскамі над работнікамі.

Каб застрахавацца і стварыць бачнасць барацьбы за перабудову работы, Казадой аддаў загады аб звальненнях, звальваючы ў адну кучу ворагаў і сумленных совецкіх работнікаў. Так быў зволен загатчык кладавой Ліпоўскі. Ніякіх падстаў да гэтага не было. Аднак, самастрахоўшчык Казадой аддае загад аб вызваленні Ліпоўскага ад работы, прычым матывы звальнення ў загадзе не ўказваюцца. Ліпоўскаму самаму прадастаўлена губляцца ў дагадках аб прычынах знятня з работы.

Другі факт. Нядаўна пад выглядам скарачэння бухгалтэрыі і «закрыцця штатнай адзінкі» (на справе ніякага скарачэння не было) Казадой вызваліў ад работы інжынера Кулькіна. Яму выплацілі выхадную дапамогу. А праз 5 дзён Казадой адмяняе свой загад і аднаўляе Кулькіна на рабоце. Характэрна, што цяпер у Кулькіна вычычаюць з пенсіі атрыманую ім выхадную дапамогу. Хіба гэта не абураючы адзек над работнікам!

Гэта замест таго, каб да канца выкрыць сапраўдных зорагаў, мабілізаваць калектыў Дзяржбанка на ўзмацненне большэвіцкай пільнасці. Некаторыя звальненні і справядлівы, але і ў гэтых выпадках Казадой не лічыць патрэбным указаць у загадах матывы знятня з работы. Калі звальняемы звяртаецца да Казадоя за растлумачаннямі, ён кароткі і двухсэнсоўна адказвае: «Гэта неабходныя іздзержкі звароту», або «Пацярпі брат, час цяпер такі». Гэтыя адказы нельга інакш расцэньваць, як толькі варожымі антысовецкімі вылазкамі.

Нібы для праверкі якасці работы і сумленнасці людзей Казадой займаецца праверваннем апарата. Нядаўна кіраўнік менскага аддзялення Дзяржбанка Каўфман разам з Казадоем падсунулі работнікам дакумент аднаго гаспадарчага органа з фальшывым падробленым подпісам нібы для высвятлення, ці будуць па ім вылачаны грошы. Гэта правакацыя выклікала справядлівае абурэнне сярод работнікаў.

Усё гэта прыводзіць да таго, што ў канторы пазбавяцца давер'е апарата да сваіх кіраўнікоў. Замест цэлавой аператыўнай работы людзі займаюцца шушуканнем па кутках, балбатнёй, абгаварваннем правільнасці ці няправільнасці звальнення таго ці іншага работніка.

Перад кожным кіраўніком совецкай установы стаіць адказная задача — ліквідаваць вынікі шкодніцтва, бязлітасна разграміць трацкісцка-бухарынскую агентуру германа-японскага і польскага фашызма, ачысціць апарат ад усякай гніді. Але гэта ні ў якім разе не дае нікому права агульна ахайваць совецкіх кадры і пад выглядам ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ўводзіць паклёпы на сумленных работнікаў, нічым сябе не скампрамеціраваўшых. Такая практыка мяжуе са шкодніцтвам і на-руку толькі ворагам народу. Яна наносіць сур'ёзную шкоду справе і апашляе самую задачу барацьбы з ворагамі.

У свеце гэтых фактаў варта ўважлівей прыглядзецца да твару самога Казадоя і высветліць, якая ў яго была сувязь з выкрытым ворагам народу, з якім ён у свой час разам працаваў у Іркутску. Апрача таго трэба ўстаналіць, хто такі яго бацька, жывучыя ў Польшчы.

С. ГАЛКІН.
М. КІН.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Ніжэй памянёныя ў спісе, выключаныя з партыі выключаюцца ў гор. Менск на Вызную тройку КПК пры ЦК ВКП(б) на 19 жніўня 1937 года: Пейгін А. Г. (Масква); Бабуцэвіч Д. М., Гінзбург Р. С., Гершановіч Б. А., Данецкі В. П., Душкін Л. Е., Домбаль-Стахульская П. А., Ерохай Ф. П., Зарэмбоўскі К. Ф., Клюеў М. Ф., Кажушка А. А., Куркоў А. М., Кійко Н. Ф., Кладнёў П. І., Ломан Н. А., Лаўрыновіч В. А., Лойка М. Ф., Ламейка Ф. С., Ліберман Х. С., Літвін З. А., Мельнікаў М. Я., Маськова І. Я., Медведзеў І. І., Матусевіч І. М., Ной А. І., Арлоў Н. В., Падбярозны А. Н., Скараход Д. Л., Саўчанка А. І., Супрунова В. Т., Сімончык П. Л., Ціханава О. Ф., Шмуйловіч Н. Я. Галавач В. І., Ляхей А. Д., Гельфман Р. М., Хільковіч В. П., Скробат Б. С., Быстрыцкі П. Г., Змачынскі В. А., Скавырка А. Л., Ганчаронак Т. А., Каган-Бараноў І. Я., Дуберштэйн Я. Ф., Дэмбін Я. І., Сухадрова В. Г., Іошпе А. Р., Розін Г. І., Федзько В. І., Вальфсон М. А., Растоўская Р. Г. Л., Дайнека А. А., Фрыдман С. М., Філка С. М., Крутковіч Х. Г., Выгоднер А. Л., Чарнушэвіч А. А., Табачнік І. Я., Давідовіч З. А., Паноў Н. А., Аракелаў М. М., Воінаў В. Л., Лупачоў І. Е., Аніс Я. Г., Аін І. Ю., Розіна А. Л., Мілюкоўскі З. Э., Нілаў А. А., Плімак О. Л., Елізараў А. Е., Межэвіч В. Н., Рубінская П. А., Еленік С. С., Хандэцкі С. Н., Шчарбакоў В. К., Каўлін Я. Я., Ісэуітаў В. Н., Шасцярноў П. Е., Лунгін Ш. І. (Менск); Альтшулер З. Х., Ганкінах І., Ермонік С. М., Злацін Л. А., Каган Е. Е., Карсакова А. А., Крупітман М. Н., Марозаў В. Н., Прудніка Е. М., Повнер С. В., Папкоў С. В., Якубсон І. М., Рубінчык Г. Е., Аскінязі Х. І., Чудноўскі Д. М., Марозаў А. А., Канстанцінаў М. М., Шляханаў А. Е., Гаманькоў І. Г., Петроў П. Я., Белкоўскі М. Л. (Магілеў); Калацей Н. І., Шпакоўскі Ф. Н., Гурскі А. О., Лянскі Р. М., Герштэйн С. М., Балабан І. Е., Гінзбург Я. Е., (Мозыр); Пухальскі І. А., Дубенка Г. Г., (Нароўля); Адаменка М. М., Зархін І. А., Седлер В. В., Юрчанка Т. М., Бурчак С. П., (Петрыкаў); Ліц А. М., Тарайкоўскі Ф. О., Разумаў С. І. (Плешчаніцы); Буракоў В. М., Малыха Н. П., Малахоўскі А. Ф. (Расоны).

Сёння, 16 жніўня, у 7 гадзін вечара у Доме партактыва (малая зала) адбудзецца інструктыўны даклад для агітатараў і дакладчыкаў на тэму аб Дні авіяцыі. Уваход па партыйных і комсамольскіх білетах.

МЕНСКІ ГАРКОМ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

Прапануецца кіраўнікам усіх прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый г. Менска,

якія яшчэ не атрымалі КАРТКІ ЎЧОТА

чысленасці персанала і зарплаты за чэрвень месяц г. г.

СЁННЯ, 16 ЖНІЎНЯ, АТРЫМАЦЬ гэтыя карткі ў горсовеце (пакой № 52).

ГОРІНСПЕКТУРА НАРГАСУЧОТА.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Памяшканне Бел. дзярж. драм. тэатра т. 24-905 | Гастролі Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР

А. Карнейчук БАНКІР

П'еса ў 4 дзеях.

Гукавы кінатэатр «Чырвоная зорка» КЛЯТВА

На летняй эстрадзе—канцэрт. аддзел.

Дзіцячы гукавы кінатэатр МЫ З КРАНШТАТА

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» ГАРОШ

На летняй эстрадзе—канцэрт. аддзел.

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал» СЫН РЫБАКА

Гукавы кінатэатр «Спартак»

Ад 16 жніўня вядомы гукавы фільм СВЯТА СВЯТОГА ЮРГЕНА

Камедыя ў 9 частках.

У галоўнай ролі Ігар Ільінскі.

ДЗЯРЖЦЫРК

Парк імя Горкага (тел. 22.725)

16, 17, 18 жніўня

Апошнія гастролі

І ВЫКРЫЦЦЁ ўсіх ВОПЫТАЎ КЛЕО ДАРОЦІ

1-я гастроль 2-ДЯРЫНГ палёт на аэраплане.

7 МОРЭНО

Веласіпедысты-фігурысты.

Пачатак у 9 г. вечара. Каса адкрыта з 10—2 і з 5—10 г. в.

ДА ЎВАГІ ВЫВУЧАЮЧЫХ замежныя мовы

ЕСЦЬ У ПРОДАЖЫ новыя падручнікі:

М. ГЕОРГІЎ

Падручнік французскай мовы.

Цана ў пер. 4 р. 60 к.

Рэкамендаван метадбюро па замежных мовах пры аддзеле рабочай моладзі ЦК ВЛКСМ для груп, курсаў і школ на прадпрыемствах.

Г. ПУРВЕР

Падручнік англійскай мовы для дарослых.

Цана ў пер. 2 р. 60 к.

СІНТАКСІС НЯМЕЦКАЙ МОВЫ.

Каган і Гермут, выданне 1937 г.

Цана 2 р. 50 к.

ПРАДАЮЦЦА ВА ЎСІХ КНІЖНЫХ МАГАЗІНАХ.

У ВЫПАДКУ АДСУТНАСЦІ КНІГ НА МЕСЦАХ З ЗАКАЗАМІ ЗВЯРТАЦЦА: Москва, Издательство иностранных рабочих в СССР, ул. 25 Октября, 7, Торготдел.

Падручнікі пасылаюцца наложным плацяжом без задатку.

Выдаткі па перасылцы за кошт выдавецтва.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛ. 21-845

ДА ВЕДАМА ТРЫМАЛЬНІКАЎ АБЛІГАЦЫЙ ДЗЯРЖАЎНЫХ УНУТРАНЫХ ПАЗЫК СССР

1 верасня 1937 г. ЗАКАНЧВАЕЦЦА ТЭРМІН АБМЕНУ АБЛІГАЦЫЙ РАНЕЙ ВЫПУШЧАНЫХ ПАЗЫК НА АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск 4 года)

У СУВЯЗІ З ПРАВЕДЗЕНАЙ У 1936 Г. КАНВЕРСІЯЙ ДЗЯРЖАЎНЫХ УНУТРАНЫХ ПАЗЫК.

АБМЕНУ ПАДЛЯГАЮЦЬ АБЛІГАЦЫІ НАСТУПНЫХ ПАЗЫК:
ТРЭЦЯЙ ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ
ПАЗЫКІ «ПЯЦІГОДКА—У ЧАТЫРЫ ГАДЫ»
ПАЗЫКІ «ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДА ПЯЦІГОДКІ»
ПАЗЫКІ «ЧАЦВЕРТАГА ЗАВЯРШАЮЧАГА ГОДА ПЯЦІГОДКІ»
ПАЗЫКІ «ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ» (ВЫПУСКАЎ ПЕРШАГА, ДРУГОГА І ТРЭЦЯГА ГОДА).

К 1 верасня 1937 года ўсе грамадзяне, якія маюць на руках аблігацыі пералічаных пазык, павінны абмяняць гэтыя аблігацыі ў ашчадных касах на аблігацыі пазыкі ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск чацвертага года).

Грамадзяне, якія захоўваюць аблігацыі гэтых пазык у ашчадных касах, могуць абмяняць гэтыя аблігацыі пры асабістай яўцы або шляхам пасылкі ў ашчадную касу пісьмовай заявы разам з захоўна-ссудным пасведчаннем.

Грамадзяне, якія падпісаліся на ўказаныя вышэй пазыкі, але не атрымаўшыя ў свой час на рукі аблігацыі ў сваім прадпрыемстве, установе, або сельсавеце, павінны запатрабаваць аблігацыі і абмяняць іх на аблігацыі пазыкі ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск чацвертага года) у цэнтральнай або раённай ашчаднай касе.

ПАСЛЯ 1 ВЕРАСНЯ 1937 Г. УСЕ АБЛІГАЦЫІ РАНЕЙ ВЫПУШЧАНЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ УНУТРАНЫХ ПАЗЫК, ЯКІЯ ПАДЛЯГАЮЦЬ АБМЕНУ У СУВЯЗІ З КАНВЕРСІЯЙ ТРАЦЯЦЬ МОЦ І АБМЕНЬВАЦЦА НЕ БУДУЦЬ.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

Галоўнае Кіраўніцтва навучальнымі ўстановамі НКЗ СССР

АБВЯШЧАЕ, што СНК СССР ПРАДОЎЖЫЎ ТЭРМІН прыёму заяў

уноўпаступаючых у сельска-гаспадарчыя ВНУ

да 20 жніўня 1937 г.

ПРЫЕМ ЗАЯЎ на гістарычны і геаграфічны факультэты

МАГІЛЕЎСКАГА ПЕДІНСТЫТУТА

і на аддзяленне літаратуры і мовы Магілеўскага настаўніцкага інстытута

ПРАЦЯГНУТ да 20 ЖНІЎНЯ г. г.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ВІЦЕБСКІ ВЕТЭРЫНАРНА-ЗААТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ

паведамляе, што

ПРЫЕМ ЗАЯЎ ад уноўпаступаючых на абодвы факультэты

ПРАЦЯГНУТ да 20 ЖНІЎНЯ г. г.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ДУБРОВЕНСКІ ПЕДРАБФАК

абвяшчае НАБОР СТУДЭНТАЎ

на 1937—1938 навучальны год,

на першы курс яўрэйскага аддзялення,
на першы, другі і трэці курсы беларускага аддзялення
і па вячэрняе аддзяленне.

Паступаючыя трымаюць іспыты на першы курс — па беларускай і рускай мовах, матэматыцы (вусна і пісьмова), па беларускай і рускай літаратуры, геаграфіі, грамадазнаўству ў аб'ёме НСШ, на 2 курс — па ўсіх прадметах 8 класаў СШ, на 3 курс — па ўсіх прадметах 9 класаў СШ. Паступаючыя на 1 курс яўрэйскага аддзялення трымаюць іспыты і па яўрэйскай мове і літаратуры. Усе паступаючыя павінны ведаць Сталінскую Канстытуцыю СССР і БССР. Усе студенты забяспечваюцца стыпендыяй, а іншагароднія — і інтэрнатам.

Прыём заяў да 20 жніўня, іспыты з 20 па 27 жніўня.

Да заявы прыкладаюцца наступныя дакументы: засведчаная аўтабіяграфія, метрыка, атэстат аб адукацыі, даведка аб стане здароўя, дзве фотакарткі і паштовых марак на 60 кап. Заявы і дакументы накіроўваць па адрасу: БССР, г. Дуброўна, дырэктару педрабфака.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Уп. Галоўлітбела № К—3013. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. К., М., Б.